Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНАГА ТАВАРЫСТВА

№ 51 (1086) БЕЛАСТОК 19 СНЕЖНЯ 1976 г. ЦАНА 60 гр.

ПРАЦА Ў СВАІМ АСЯРОДДЗІ

II ПЛЕНУМ ГП БГКТ

28 лістапада ў Беластоку адбыўся II пленум Галоўнага праўлення БГКТ з удзелам намесніка старшыні Ваяводскай рады нарадовай, сакратара Ваяводскага праўлення прафсаюзаў Леакадзіі Зіневіч і прадстаўніка Ваяводскага камітэта ПАРП Аляксандра Сеўкі.

Распачаўся пленум уручэннем узнагарод. Сярэбраны знак „Заслужаны для Беласточчыны" Леакадзія Зіневіч уручыла членам гарадоцкага жаночага харавога калектыву БГКТ — Ірэне Паўлючук і Вользе Мядзведзевай, а таксама настаўніцы пачатковай школы ў Скупаве (гміна Нараўка) — Марыі Навіцкай. Медаль „20-годдзя БГКТ" быў уручаны: Янку Аляксеюку, Язэпу Альшэўскаму, Васілю Антыпюку, Лідзіі Бялецкай, Хведару Галёнку, Пятру Госціку, Янку Зенюку, Язэпу Навіцкаму, Уладзіміру Раеўскаму, Мікалаю Суліме, Галене Тапалянскай, Альжбеце Цаглярскай і Уладзіміру Юзвюку.

Затым старшыня ГП Мікалай Самоцік прачытаў даклад прэзідыума „Задачы і формы працы, вынікаючыя з пастановы VIII з'езду БГКТ, а таксама дапамога Галоўнага праўлення ў гэтай галіне". У зменевай арганізацыйнай структуры, калі ліквідаваны ў нас аддзелы, выкананне праграмных задач у асноўным будзе залежыць ад працы гурткоў, іх праўленняў і актывістаў. „Гурткі БГКТ, — гаварылася ў дакладзе, — павінны шмат зрабіць у галіне культурна-асветнай дзейнасці, павінны ў як найшырэйшай ступені заняцца папулярызацыяй беларускай культуры ў асяроддзі, якая з'яўляецца неад'емнай часткай культуры нашай краіны, павінны па прыкладу гурткоў у Меляшках, Арэшкаве і Тапчыкалах арганізоўваць мерапрыемствы, звязаныя з народнымі традыцыямі: вечарынкі, вяселлі, дажынкі і г.д.

У дакладзе прысвечана многа месца ўдаскнальванню гурткамі ранейшых форм дзейнасці — аўтарскіх сустрэч з бэгакатоўскімі літаратарамі, вечарын з нагоды розных гадавін, фэстынаў, мастацкай самадзейнасці і г.д. Асабліва падкрэсліваецца неабходнасць збірання і захавання беларускага фальклору, пашырэнне чытання беларускага друку.

Зразумела, што Галоўнае праўленне не звальвае гэтых вельмі важных спраў толькі на гурткі БГКТ. Яно само робіць і будзе рабіць многа арганізацыйных западаў, каб наша культура належна ўспрымалася і развівалася ў беларускім асяроддзі. З гэтай мэтай будзе праводзіцца праца з грамадскім актывам, са старшынямі гурткоў БГКТ, з лектарскай групай.

БГКТ будзе яшчэ больш актыўна супрацоўнічаць з тымі арганізацыямі, якія дзейнічаюць у беларускім асяроддзі. ГП будзе супольна з ваяводскай бібліятэкай кожны год праводзіць чытальніцкі конкурс беларускай кнігі, а таксама адновіць супольнае арганізаванне семінараў для бібліятэкараў. А супольна з асветнымі ўладамі ГП наладзіць шырэйшы кантакт з дырэктарамі гмінных школ і настаўнікамі беларускай мовы, а таксама будзе рабіць захады, каб у Бельску на базе ліцэя з беларускай мовай навучання была ў будучыні створана 2-гадовая напрамкавая школа беларускай філалогіі. Будзе імкнуцца таксама забяспечыць школы праграмамі навучання, падручнікамі, мастацкай літаратурай і навучальнымі дапаможнікамі, арганізоўваць кожны год сярод вучняў дэкламатарскі і песенны конкурс.

(Працяг на стар. 4)

У НАШЫХ САМАДЗЕЙНІКАЎ

Зіна Трэска, вучаніца Бельскага беларускага ліцэя выконвае ролю маці ў п'есе „Гарадскія госці" А. Барскага.
Фота Я. Цялушэцкага

Чаго дамогся — не цікава,
Што збылося — драбната,
І слава, што была ласкавай,
Нібыта лашчыцца не так.

А мы праз славу ды праз тую
Зноў прагнем нейкіх новых дзіў —
Незадаволена прастуем
Шукаць, дзе шчасце нерастуе,
Дзе нехта радасць нарадзіў.

Бо нас хвалюе толькі тое,
Што недасяжнае якраз
І што. як промень, залатое
На небасхіле дражніць нас.

А дасягнеш — і ўсё збудзённіць:
Бы попел сеў на вугалёк,
Паблякне ўсё, што покуль сёння
Святочна вабіла здалёк.

І ўсё ж мы далей прагнем свята —
Аж да апошняе мяжы.
І дамагаемся упарта,
Бо дамагацца — значыць жыць!

Янка Сіпакоў

НЕ ТОЛЬКІ ХЛЕБАМ І ПРАЦАЙ

Так, не толькі хлебам і працай жыве чалавек. Добра, што зразумелі гэта прафсаюзныя дзеячы і праводзяць шматмаштабны *агляд культурнай актыўнасці працоўных.*

На Беласточчыне асабліва заслужылася ў гэтай галіне **Леакадзія Зіневіч** — сакратар Ваяводскай рады прафсаюзаў.

Калі ў пачатку гэтага года яна знаёміла беластоцкіх журналістаў з багатай праграмай *агляду культурнай актыўнасці працоўных,* проста не хацелася верыць, што гэта будзе здзейснена, бо прывыклі мы да актыўнай дзейнасці дзеля мінутнага эфекту.

А тут — дзякуючы паслядоўнасці ў працы, дзякуючы асабістай энергіі Леакадзіі Зіневіч — гэтая багатая праграма добрых манераў цесна звянчалася з рэальным жыццём.

Найперш у беластоцкай кавярні „Прафсаюзная" („Звёнзкова") быў наладжаны цыкл культурна-грамадскіх мерапрыемстваў пад супольнай назвай *„Радаслоўныя, запісаныя працай".*

Замысел просты, як простым з'яўляецца ўсё, што культуру і навуку рухае мілёвымі крокамі наперад па шляху яе развіцця. Гэтыя *„радаслоўныя, запісаныя працай"*, сталіся нагляднымі ўрокамі нашай мясцовай беластоцкай гісторыі, урокамі нашых бясспрэчных дасягненняў. Бо вось на сустрэчу прыходзіць сям'я тэкстыльшчыкаў і з'яўляецца перад намі жывая гісторыя тэкстыльнай прамысловасці беластоцкай акругі, калі пра свой жыццёвы шлях апавядаюць нам пяць пакаленняў гэтай сям'і. Апавядаюць звычайна, як пражылі, чаго дабіліся, якім коштам здабывалі хлеб і працу. Можна ў іх запытаць пра ўсё, што толькі прысутным падабаецца, каб развеяць уласны недавер,

(Працяг на стар. 5)

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У "НІВЕ"

Белавежскі нацыянальны парк ● Бацікі Заднія ● Запаведнікі злачынстваў ● У тэатры над Заходняй Дзвіной ● Дні савецкага фільма ● Новае ў народным будаўніцтве ● Гісторыя беларускага адрыўнога календара ● Поспехі беластоцкіх СКР ● Навучанне беларускай мовы ў 1976/77 годзе ● Весткі з Міхалова, Дашоў, Бельска, Гайнаўкі, Лукі, Слоі ● Калі сняцца медныя грошы ● Песня „Czy będzie mi z tobą dobrze".

БЕЛАРУСКІЯ АКЦЭНТЫ Ў БЕЛАВЕЖСКІМ МУЗЕІ

Прыродазнаўчы музей БНП у Белавежы паказвае перш за ўсё флору і фауну Белавежскай пушчы. Але ёсць тут таксама многа іншых цікавых секцый, у якіх наведвальнік можа азнаёміцца з гісторыяй пушчы, з паляўніцтвам, з пушчанскай прамысловасцю. Вялікае зацікаўленне выклікае заўжды этнаграфічная секцыя, у якой можам убачыць шматлікія экспанаты — помнікі матэрыяльнай культуры беларускага народу. Сабраны яны ў асноўным па вёсках, сумежных з Белавежскай пушчай, а часамі і ў самой Белавежы. Цэлая секцыя падзелена на часткі. Самая галоўная — гэта вырабы з драўніны. І ад яе варта пачаць.

Як правіла, наведвальнікі найбольш увагі прысвячаюць тут плеценай баране, зробленай у 1920 г. Калінікам Якубюком з Чэхаў Арлянскіх, затым ступе з таўкачом, выкананай у 1890 г. Аляксандрам Федаруком з сяла Ваські, капаньцы, у якой калісьці мылі бялізну, адзежу ці нават купалі малых дзяцей. Цікавая таксама драўляная лапата, акаваная бляхай (з 1914 г.). Даставіў яе Шыман Шпаковіч з Белавежы.

Многа экспанатаў паходзіць з вёскі Рэпіскі. Толькі Архіп Тэляшэўскі даставіў 4 кадаўбкі і 1 драўляны посуд на гарох. Адзін з кадаўбкоў, т.з. чвэртка, зроблены аж у 1886 г., а крыху меншы ад чвэрткі — яшчэ ў 1865 г. Астатнія кадаўбкі датуюцца 1892 і 1912 гадамі, а посуд на гарох — 1913 годам. Варта сказаць і пра кадаўбок на мёд, зроблены ў 1905 г. Тарасом Федаруком, таксама з Рэпіскаў, кадаўбкі А. Садоўскага з Рыбакоў (1925 г.) і Нікіты Анапюка з Мора (каля 1890 г.). На выстаўцы паказана яшчэ 5 кадаўбкоў, ды ўжо выкананых па-сучаснаму.

Паказваецца таксама драўляная бочачка Н. Анапюка (зроб. у 1890 г.), драўляны посуд на ваду Клімента Чыквіна з Чэхаў Арлянскіх (1920 г.), рэзчык Васіля Данілюка з Сушчы (1947 г.), ляшчоткі (ціскі для воску) Трафіма Такаюка з Мікуліч (1897 г.), лапата для хлеба Яна Стоцкага з Лукі (каля 1920 г.), калаўрот Андрэя Гаўрылюка з Крыўца (1965 г.), драўляны таўкачык для бульбы Емяльяна Сегеня з Рэпіскаў (1943 г.), драўляны чарпак для разлівання стравы Паўла Буры з Бандароў (1897 г.), меру Станіслава Харкевіча з Слабодкі (1860 г.), ступку для солі Піліпа Цецюка з Макаркаў (1876 г.) і 2 ступкі Дзмітрыя Самоціка з Лукі (1918 г.) і Ксені Тарасюк з Койлаў (1860 г.). Варта таксама назваць ярмо, зробленае ў 1880 г. у Бандарах, драўляны кубак, такі ж цабэрчык і пасажную скрыню, выкананую ў 1961 г. у Гайнаўцы спецыяльна для музея.

Цікавіць турыстаў і частка, у якой паказваюцца пляцёнкі. Асабліва арыгінальна прадстаўляецца карзіна, зробленая каля 1850 г. Давідам Тапалеўскім з Клейнік, 2 кайстры з 1860 г., адна, сплеценая з лыка Кірылам Яконюкам, другая, з бярозавай кары — Янам Шыло (абодва з Койлаў), фаска — таксама з бярозавай кары — з 1923 г., выкананая Сцяпанам Пушынскім з Новай Луплян-

(Працяг на стар. 4)

БЕЛАРУСКІЯ ГЕРОІ АЛІМПІЯДЫ

Час Алены Бяловай

У 1968 годзе пасля таго, як яна першай з савецкіх рапірыстак стала алімпійскай чэмпіёнкай у асабістым турніры, заваявала „Прыз нечаканасці“, пра яе пісалі: „Алена Новікава (гэта яе дзявочае прозвішча) сапраўдная сенсацыя Алімпіяды. Яшчэ ніхто не дабіваўся такога поспеху адразу пасля перамог на маладзёжных першынствах свету. У патэнцыяле гэта спартсменка можа выступіць нават у Мюнхене“. Дададзім, што ў Мехіка Бялова заваявала „золата“ і ў камандных спаборніцтвах.

Пасля Мюнхенскай алімпіяды, калі Бялова стала чэмпіёнкай у камандным турніры, пра яе ў адным з артыкулаў было напісана: „Трэнеры зборнай разлічваюць, што Алена Бялова, спартсменка па-сапраўднаму мужная, валявая, зможа выйсці на фехтавальную дарожку Манрэаля“.

Тады, прама скажам, у гэта нямногія верылі, але вось вынік XXI гульняў для Бяловай: залаты медаль у камандным турніры і бронзавы ў асабістым.

І зусім зразумела, што самым першым пытаннем, якое я задаў ёй у Мінску, было:

— Ці можна цяпер як і раней напісаць: „Алена Бялова выступіць на Алімпійскіх гульнях 1980 года ў Маскве“?

— Спяшацца не трэба. Наперадзе яшчэ шмат часу. Да таго ж, у мяне ёсць прыкмета: нічога не загадваць наперад. Я і тады, пасля першай у сваім жыцці Алімпіяды, не загадвала далёка наперад і ніякіх абяцанняў не давала. Хаця на гэта былі падставы: я была самай маладзейшай у камандзе. Мне было, паверце, нават страшнавата побач з такімі майстрамі, як Галіна Гарохава, Аляксандра Забеліна, Таццяна Самусенка. Перамога тады ўспрымалася мной як нейкі цуд, хаця трэнеры Ларыса Пятроўна і Герман Мацвеевіч Бокуны верылі ў мяне. У Мюнхене я зноў жа была самай маладзейшай у камандзе. Але я ўпэўнена цяпер ужо адчувала сябе з тымі ж Галінай Гарохавай, Аляксандрай Забелінай, сваёй даўняй сяброўкай мінчанкай Таццянай Самусенка. А пасля вы ведаеце, што адбылося — за час паміж дзвюма Алімпіядамі пакінулі вялікі спорт ветэраны, і я засталася ў паядынкі ў мяне ішлі нармальна — ніводнага не прайграла.

— А які паядынак запомніўся больш за ўсё?

— Вядома, сустрэча нашай каманды ў рашаючым паядынку са зборнай Францыі. Мы выйгралі з лікам 9:2 і заваявалі „золата“. Трэба было бачыць шчаслівыя твары нашых дзяўчат!

— Алена, усе вашы тытулы цяжка пералічыць. Перамогі на чэмпіянатах свету, краіны, розыгрышы Кубка Марціні... Аднак радасць ад алімпійскай узнагароды, відаць, асаблівая...

— У мяне чатыры залатыя медалі. Так, яны самыя дарагія. Калі спартсмен упершыню ў жыцці трапляе на алімпійскія гульні, то ён аказваецца ў атмасферы вялікага напружання. Ад яго патрабуецца жалезная вытрымка, уменне змагацца да апошняга, таму што ў спорце няма вышэйшага тытулу, чым чэмпіён Алімпійскіх гульняў, і



Мінскі Палац спорту.

камандзе старэйшай. А прыйшлі ў зборную маладыя рапірысткі Вольга Князева, Валянціна Ніканава, Наіля Гілязава, Валянціна Сідарава. Вопыт у іх быў, вядома, меншы, чым у старога саставу зборнай СССР, аднак былі талент, жаданне перамагчы, быў сапраўдны байцоўскі характар. У камандным турніры кожны з удзельнікаў Алімпіяды марыць пра залаты медаль. Таму такой барацьбы, як на Алімпіядах, няма ні на адных спаборніцтвах. І ў спартсмена няма больш прыемнага моманту, чым уручэнне алімпійскага залатога медаля.

К. Сізоў

TELEWIZJA WARSZAWA

Sobota — 18.XII. 6.30 Tech. Rol. Mat. 7.30 Biolog. 9.00 Dla szkół: Nauka o czł. kl. VIII. 10.00 Czerwone, żółte, ziel. 11.05 Geogr. kl. VIII. 11.35 07 zgłoś się — film ser. 13.30 Tech. Rol. J. pol. 14.00 Hod. zwierz. 14.25 Red. szkol. zap. 14.35 Pr. dnia. 14.40 5 pytań o Węgrzech. 15.20 Dla dzieci. 15.40 Radzimy rolnikom. 16.00 Dziennik. 16.10 Obiektyw. 16.30 100 pytań do Sylwestra Chęcińskiego. 17.15 Sobota Mł. 18.15 Panama Soberana — film dok. 19.00 Dobronoc. 19.30 Dziennik. 20.40 Daleko od szosy — film ser. 22.10 Dziennik. 22.25 Turniej płytowy. 23.30 Wielka kariera — film fab.

☆

Niedziela — 19.XII. 6.45 Tech. Rol. J. pol. 7.15 Tech. Rol. Hod. zwierz. 7.45 Now. w domu i zagr. 8.10 Alarm przeciwpoż. 8.20 RTV Szkoła Śred. 8.35 Sport. 8.55 Pr. dnia. 9.00 Teleranek. 10.20 Antena. 10.45 Wielkie bitwy historii. 11.40 Dziennik. 12.00 Rolnicze rozmowy. 12.30 Nie taki diabeł straszny — pr. muz. 13.10 Klub Sześciu Kont. 14.00 Dla dzieci. 15.05 Los. Duż. Lot. 15.20 Studio Interdisco przedst. 16.20 W Starym Kinie. 17.40 Sport. 19.00 Wieczorynka. 19.30 Dziennik. 20.40 Bajka dla dor. 20.50 Wojna i pokój — film ser. 21.40 Śpiewa Nana Mouskouri. 22.30 Sport.

☆

Poniedziałek — 20.XII. 15.50 NURT. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 17.40 Siedemnaście mgnień wiosny — film ser. 19.00 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.40 Teatr Telewizji: G.B.Shaw „Nigdy nic nie wiadomo”. 22.10 Recital W. Młynarskiego. 22.45 Dziennik.

☆

Wtorek — 21.XII. 11.30 Wojna i pokój — film ser. 13.45 Tech. Rol. 14.30 Mech. Rol. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Studio Mł. 17.50 Świat i Polska. 18.25 W Starym Kinie. 18.50 Radzimy rolnikom. 19.00 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.40 Gwiazdkowe wspomnienie — film fab. USA. 21.35 Andrzej i Eliza — pr. rozr. 22.15 X Y Z cz. I. 22.55 Dziennik.

☆

Środa — 22.XII. 6.30 Tech. Rol. Mat. 7.00 Mech. rol. 9.00 Kino TDC — Podróż do miasta, którego nie było — film fab. ZSRR. 11.30 Gwiazdkowe wspomnienie — film fab. USA. 15.50 NURT. Pr. dnia. 16.15 Lekt. Pegaza. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 17.45 Los. Mał. Lot. 18.10 Godzina rodziny Przypkowskich. 19.00 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.40 Filmy Bergmana — Hańba. 22.25 Wieczorne serenady. 22.40 Dziennik.

☆

Czwartek — 23.XII. 9.00 Kino TDC — Detektyw Piotr — film fab. NRD. 11.30 Hańba — film fab. 13.10 Decyzje piętnastolatków. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw 17.00 Ekran z Bratkiem. 18.00 Huta. 18.30 Pr. muz. 18.50 Radzimy rolnikom. 19.00 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.40 Teatr Sensacji: W. Fairchild — Okup. 22.10 Pegaz. 22.55 Dziennik.

☆

Piątek — 24.XII. 16.00 Pr. dnia. 16.05 Dziennik. 16.15 Bajkowy koncert życzeń. 17.05 Kolędy polskie. 17.30 Tajemnice mórz — film dok. 18.20 Album muzyki polskiej — pr. muz. 19.00 Wieczorynka. 19.30 Dziennik. 20.40 Koncert Wigilijny. 21.05 Cartouche — zbójca — film fab. franc.-włosk. 23.05 Allewizja.

☆

Sobota — 25.XII. 9.00 Świąteczny poranek TDC. 10.00 Z piekła do Teksasu — film fab. USA. 11.40 Marsz, marsz polonia. 12.00 Teatr Muzyki — Jan Strauss. 12.50 Dla dzieci. 13.35 W Starym Kinie. 14.50 Melodie przedmieścia. 16.20 Tele-echo. 17.20 Fantomas contra Scotland Yard — film fab. włosko-franc. 19.00 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.40 Daleko od szosy — film ser. 22.05 Zaproszenie do tańca.

☆

Niedziela — 26.XII. 9.00 Świąteczny poranek TDC. 10.10 Antena. 10.40 W Starym Kinie. 12.00 Tylko w Niedzielę.

ШТО НОВАГА?

Гандляры „белай смерцю“

Падзеі, якія адбыліся не так даўно на поўначы Тайланда, непадалёк ад горада Чыангмай, нагадвалі сцэну з прыгодніцкага кінафільма. Дзесяткі паліцэйскіх і пагранічнікаў пры падтрымцы верталётаў штурмавалі падпольную фабрыку па вырабу наркотыкаў. Уварвацца туды ўдалося толькі пасля паўгадзіннай перастрэлкі. Паліцыя захапіла амаль дзевяноста кілаграмаў гераіну і морфію, кошт якіх вылічваецца мільёнамі долараў. Аднак гэта літаральна кропля ў моры наркотыкаў, якія распаўсюджваюцца з Паўднёва-Усходняй Азіі па ўсяму свету.

Вывазам ядавітага зелля займаюцца шматлікія гангстэрскія сіндыкаты, на чале буйнейшых з якіх стаяць былыя афіцэры гаміндanаўскай арміі Кітая Ло-Туан і Лі Вэнь-хуан, якія атрымалі цяпер мянушку „генералаў джунгляў“. У распараджэнні гэтых банд сучасная зброя і навейшая тэхніка. Нярэдка сіндыкаты падкупляюць нават паліцэйскія службы. У якасці асноўнай перавалачнай базы, адкуль наркотыкі распаўсюджваюцца па многіх краінах Паўднёва-Усходняй Азіі, часцей за ўсё выкарыстоўваецца Ганконг.

Грамадскасць у азіяцкіх краінах праяўляе усё большую заклапочанасць у сувязі з пастаянным ростам маштабаў наркаманіі. Цяпер лік афіцыйна зарэгістраваных наркаманаў складае ў Тайландзе больш як 400 тысяч, у Ганконгу — 100 тысяч, на Філіпінах — 30 тысяч, у Малайзіі — звыш 10 тысяч чалавек. Аднак у сапраўднасці наркаманаў значна больш. Асаблівы непакой выклікае той факт, што найбольшае пашырэнне наркаманія атрымлівае сярод моладзі. Як заявіў кіраўнік інданезійскага цэнтра па лячэнню наркаманаў прафесар Кусуманта, злачынныя дзеянні гандляроў, якія ўцягваюць юнакоў і дзяўчат у вір наркаманіі, можна параўнаць са „змовай ворага, які мае на мэце аслабіць апору кожнай нацыі — яе маладое пакаленне“. Не трэба забываць і аб тым, што кантрабандны гандаль наркотыкамі наносіць значную шкоду эканоміцы азіяцкіх дзяржаў.

Цяпер у шэрагу краін Азіі прыкметна актывізавалася барацьба з наркаманіяй. У буйных гарадах Інданезіі і і Малайзіі часта праводзяцца аблавы на гандляроў наркотыкамі. А нядаўна Сінгапур і Інданезія аб'явілі аб прыняцці закона, які прадугледжвае пакаранне смерцю за распаўсюджванне наркотыкаў. Аднак, бадай, адзіным вынікам гэтых крайніх мер стаў рэзкі рост цэн на ядавіты тавар на чорным рынку.

Да вельмі несуцяшальных вывадаў прыйшлі і прадстаўнікі чатырнаццаці краін — удзельніц спецыяльнай нарады па барацьбе з наркаманіяй, якая адбылася нядаўна ў Тайландзе. Яны адзначылі, што „ніякіх канкрэтных поспехаў у распрацоўцы сістэмы кантролю над спажываннем наркотыкаў у бліжэйшы час не чакаецца“.

На жаль, для таго песімізму ёсць важкія падставы. Бо залогам поспеху можа стаць барацьба з наркаманіяй як з сацыяльным злом, выкараненне саміх крыніц распаўсюджання гэтай заганы. Між тым, магчымасці для належнай арганізацыі такой барацьбы ў многіх краінах Азіі ўсё яшчэ вельмі абмежаваныя. Як вымушаны быў прызнаць адзін з тайландскіх чыноўнікаў: „Спатрэбіцца вельмі шмат грошай, каб на справе даказаць горцам, што іншыя сельскагаспадарчыя культуры, у прыватнасці рыс, боб, кофе могуць стаць для іх не менш прыбытковымі, чым опійны мак. Аднак у краін Паўднёва-Усходняй Азіі няма такіх сродкаў“.

В. Віктараў

ХРОНІКА

■ 21.XI „Каласкі“ выступілі з канцэртамі ў Піражках і Кнышэвічах.

■ 17.XI. кінаперасоўкай ГП БГКТ у Палічнай, Кляшчэлях і Чаромсе быў паказаны савецкі фільм пад загалоўкам „Сокалава“.

■ 27.XI гурток вясковых жанчын з удзелам членаў гуртка БГКТ ў Новым Беразове (гміна Гайнаўка) арганізаваў танцавальную вечарыну з дэгустацыяй кулінарных вырабаў.

■ 27.XI гарадскі гурток БГКТ у Беластоку падрыхтаваў традыцыйную вечарыну „Андрэйкі“.

■ Нядаўна гурток БГКТ ў Белках (гміна Мілейчыцы) атрымаў тэлевізар, якім раней карыстаўся сямяціцкі аддзел БГКТ з сядзібай ў Мілейчыцах.

М. Х.

Калектыў „Нівы“ выказвае глыбокае спачуванне

МІХАСЮ ХМЯЛЕЎСКАМУ

у сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БАЦЬКІ

ГП БГКТ выказвае глыбокае спачуванне старшыні Рэвізійнай камісіі

МІХАСЮ ХМЯЛЕЎСКАМУ

з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці БАЦЬКІ

ТЭЛЕВІЗІЯ МІНСК

Piątek 17.XII — 7.30 Film fab. 16.15 Hokej Kanada—Szwecja. 19.30 Wszechzw. konkurs mł. wykonawców. 20.40 Hokej ZSRR — Finl. 3 terc.
Sobota 18.XII. — 9.30 Koncert. 11.00 W świecie zwierz. 12.00 Hokej. Czechosł. — Finl. 14.25 Film fab. 20.00 Koncert. 21.00 Sport.
Niedziela 19.XII — 9.00 Koncert. 12.00 Hokej. ZSRR — Kanada. 14.15 Koncert. 15.00 Filmy anim. 15.30 Koncert. 16.15 Klub film. 17.15 Film dok. pośw. 70 rocz. ur. L. Breżniewa. 20.00 Hokej Czechosł. — Szwecja.

КІНО

Białowieża Krótkie życie — pol. 21—22. Tragedia Posejdona — USA 23—24. Con Amore pol. 25—26.

Bielsk Podl. Mgła — pol. 21—22. Ojciec Chrzestny II — USA 23—24. Pirat — mek. 25—26.

Czyże Bilans kwartalny — pol. Operacja „Dąb” — jug. 22—26.

Dubicze Cerkiewne Znikąd donikąd — pol. Podróż — wł. 22—26.

Gródek Krótkie życie — pol. 25—26.

Kleszczele Niewygodny kochanek — wł. 21—22. Tak zaczyna się miłość — czes. 23—24. Policjanci — USA 25—26.

Michałowo Taka była Oklahoma — USA 21—22. Zachłanne miasto USA 23—24. Skazany — pol. 25—26.

Mielnik Słodki dom — bel. 22. Niewinni o brudnych rękach — fr. 25—26.

Milejczyce Polewaczka — węg. 21—22. W te dni przedwiosenne — pol. 23—24. Werdykt — fr. 25—26.

Narew Jesień debiutantów — rum. Anna i komandor — radz. 23—26.

Narewka Królewskie marzenie — USA. Czarodziejskie dary — NRD 22—26.

Nurzec Poczekam aż zabijesz — czes. 21—22. To niemożliwe — radz. 23—24. Con amore — pol. 25—26.

Orla Hallo taxi — NRD. Kalendarz warszawski — pol. 22—26.

Rajsk Iwan Kondarow — buł. Zdradzieckie gry miłosne — czes. 22—26.

B.Z.Graf. Zam. 2903 F-4

З ГІСТОРЫІ НАШЫХ ШКОЛ

ТУТ НЕ ВЫВУЧАЮЦЬ БУКВАР НАПАМЯЦЬ

Калі ў 1523 г. па волі караля польскага і вялікага князя літоўскага Зыгмунта I паўстае ва ўладаннях гаспадарскіх, г. зн. князеўскіх, места Кляшчэлі, у тадышніх граматах яшчэ нічога не чуваць пра школу ў ім. Маўчаць пра яе і дакументы з другой паловы XVI стагоддзя, з якіх вядома, што ў Кляшчэлях было тады звыш дзвюх тысяч насельніцтва, а на праплываючай каля іх рэчцы Нурэц знаходзілася 23 млыны і жалезная кузніца. З інвентара ад 1616 г. даведваемся, што ў гэтым „славэтным месце каралеўскім“ было 32 карчмы піўныя, 17 — гарэлачных і 3 — мядовыя, 43 мяшчан займалася гандлем, але няма там ані слова пра школу. Аднак цяжка паверыць, каб такое бойкае мястэчка са значнай колькасцю рамеснікаў і купцоў магло абыходзіцца без установы, якая б навучала маладое пакаленне хоць бы чытанню, лічэнню і пісанню. Відаць, навучанне ў Кляшчэлях адбывалася на нядрэнным узроўні, калі ў гадах 1510 — 1560 з гэтага мястэчка паходзіць адзін са студэнтаў Кракаўскага універсітэта, а тамашнія купцы патрапілі весці вельмі актыўны і карысны для сябе гандаль нават з адлеглым Крулеўцам.

У мястэчку ў 1794 г. была школка, хадзіла ў яе 10 дзяцей ва ўзросце ад 5 да 12 год, а настаўнік Я. Свярчынскі вывучаў з імі „буквар на памяць“.

На чвэрць стагоддзя пазней, у 1820 г., дырэктар Беластоцкай школьнай акругі А. Ю. Лявіцкі ў часе службовай паездкі ў Кляшчэлі канстатаваў у іх аж дзве школы — адну пры рымска-каталіцкай парафіі (79 вучняў), другую пры уніяцкай (6 вучняў). У сваёй справаздачы з гэтай візітацыі ён, між іншым, піша: „...у другой школцы пры рускай (г. зн. уніяцкай — М. Г.) царкве вучацца дзеці чытаць і пісаць па-польску і паславянску...“ Пра навакольныя мясцовасці ён жа заўважае: „Жыхары вёсак маёмасцей скарбовых прыналежных гораду кароннаму Кляшчэлям парафіі святара Сасноўскага рашылі ўтрымоўваць школкі ў чатырох вёсках: Кузава, Дашы, Дабрывада і Чарэмха і абавязаліся не толькі ўтрымоўваць настаўніка і даглядаць школку, але адначасова дапільнаваць, каб дзеці пасля сямі год на навуку ў гэтыя школкі аддаваліся“. Такая ж школка працавала і ў вёсцы Сухавольцы. У гэтых школках займалася даволі многа дзяцей: у Дашах — 28 вучняў, Дабрывадзе — 21, Кузаве — 30, Сухавольцах — 20, Чаромсе — 23. Хоць гэтае незвычайнае імкненне да асветы ўтрымоўвалася сярод насельніцтва і на працягу наступнага стагоддзя, але не было адпаведных грамадскіх умоў для здзяйснення запаветных мараў многіх клешчалян. Амаль ніхто з іх не здолеў узняцца вышэй пасады канторскага служачага, валаснога пісара ці бакалаўра ў парафіяльнай школцы. Што ж, і для царызма і для санацыі адукаваныя людзі з народа былі вельмі непажаданай з'явай.

Карэнныя змены наступілі толькі ўвосень 1939 г. ужо пры савецкай уладзе: маса дзяцей і моладзі тады запоўніла школу, на дапамогу мясцовым настаўнікам прыбылі высокакваліфікаваныя педагогі з Савецкай Беларусі і іншых рэспублік СССР — разам працавала тут 13 настаўнікаў, сцены школкі ледзь здолелі змясціць шматасабовыя двайныя і трайныя класы, а трэба было рыхтавацца да арганізавання дзесяцігодкі. Пачалася разбудова школы, але яе давялося адкласці на доўгія гады — пачалося гітлераўскае нашэсце. І ўсё ж тыя кароткія два гады не прапалі дарма, яны разбудзілі і апладатварылі свядомасць людзей. Гэтаму прыклад хоць бы і тое, што сярод 16 выпускнікоў сёмага класа з 1941 г. сёння Т. Маркевіч з'яўляецца настаўніцай, Р. Федарук — лекарам ветэрынарыі, Я. Максімюк — інжынерам. Іменна гэтыя традыцыі натхнялі грамадства, калі яно пасля вызвалення пачало арганізаваць школу. Як сведчаць захаваныя ў школьным архіве дакументы, інспектарат асветы ў Бельску загадам ад 4 кастрычніка 1944 г. назначыў кіраўніком школы працаваўшага тут шмат год настаўніка Э. Зямянскага, разам з ім пачалі працаваць настаўнікі: В. Астроўскі, Т. Гдэш, А. Калішэвіч, Д. Максімчук, М. Трафальская. Ужо 20 кастрычніка школа працавала поўнай парай, вучылася ў ёй 278 дзяцей і моладзі, былі паралельныя класы з польскай і беларускай мовай навучання.

Разам з развіццём і ўмацаваннем усёй нашай краіны мацнейшыя станавіліся настаўніцкія кадры і матэрыяльная база школы. У 1955 г. яна пераходзіць са старога, збудаванага ў 1934 г. цеснага будынка ў новы, пабудова якога была пачата яшчэ ў 1940 г. І штогод выходзілі са школы ўсё новыя дзесяткі выпускнікоў, каб падацца ў сярэднія школы Бельска, Гайнаўкі, Беластока, а пасля іх заканчэння — на першую самастойную працу або ў вышэйшую школу. Сярод іх сёння Г. Артысевіч з'яўляецца лекарам, А. Асташэўская — юрыстам, Л. Бяловец — доктарам біялогіі, Т. Васілеўская — зубным урачом, Я. Длужэўскі — архітэктарам, А. Капэлька — доктарам архітэктуры, І. Максімчук — лекарам, Л. Паплаўскі — настаўнікам, К. Санкевіч — магістрам інжынерам па сельскай гаспадарцы, П. Яноўскі — пасля заканчэння Кансерваторыі ў Кракаве працуе салістам у кракаўскіх тэатрах і г.д.

А сёння дырэктар зборнай гміннай школы ў Кляшчэлях А. Такаюк разам з 12-асабовым настаўніцкім калектывам у 12 аддзелах школы навучаюць 223 вучняў (разам з філіялам школы ў Дабрывадзе). Настаўніцкі калектыў мае нядрэнную падрыхтоўку: 3 асобы закончыла педагагічны ліцэй, 8 — настаўніцкую студыю, 2 — вышэйшую настаўніцкую школу, у бягучым годзе 3 настаўнікаў завочна вучыцца на магістэрскіх курсах, у будучым — у іх прымуць удзел наступныя два настаўнікі. Школа забяспечана самымі сучаснымі вучэбнымі дапаможнікамі, а дырэкцыя ўвесь час клапоціцца пра разбудову яе памяшканняў, бо „недалёкі той час, калі ў Кляшчэлях упершыню ў іх гісторыі будзе дзесяцігадовая сярэдняя школа“, — заўважае дырэктар А. Такаюк, абводзячы мяне па новай, збудаванай бацькамі грамадскай працай кухні пры школьнай сталовай, якая неўзабаве будзе рыхтаваць па 150 абедаў у дзень для школьнікаў.

І аж цяжка паверыць, што тут некалі вывучалі „буквар напамяць“...

Мікалай Гайдук

Літаратура

1. Teofilewicz D., Działalność Komisji Edukacji Narodowej w województwie podlaskim, W-wa 1971.
2. Туронак Ю., Нарыс развіцця школьніцтва на Беласточчыне ў перыяд 1773-1939, Навуковы зборнік, Беласток 1974.

Наша галерэя

В. Марковіч. Свята ў Докшыцах.

ПАСТАВІЛІ, АЛЕ НЕ ЗАКОНЧЫЛІ

Грамадскія пачыны гэта вялікая рэч. На след іх можна трапіць, калі наведаць тую ці іншую новую будову. Бачны яны ў адрамантаваных жвіровых дарогах, пасаджаных дрэўцах, у новых святліцах. У апошнія гады не інакш будуецца святліца ў вялікай вёсцы Рыбалы, што па шашы ад Заблудава ў Бельск. Тут да пабудовы вельмі патрэбнага культурнага аб'екту тутэйшыя амбітныя гаспадары прыступілі ў студзені 1975 года. Месца пад святліцу знайшлося ў сярэдзіне вёскі, у самым відным месцы. Жыхары Рыбалаў выбралі для гэтай мэты драўляны будынак, які купілі ў Беластоку, там разабралі ды прывезлі адтуль у сваю вёску. Калі будынак у два паверхі быў збудаваны ды пакрыты, у сярэдзіне яго пабудавалі падлогу, столь, вокны і дзверы. Усё гэта нямала каштавала. Таму ўсе гаспадары ўнеслі апрача грамадскай працы добраахвотныя грашовыя ўклады. Кошт пабудовы святліцы ацэньваецца ў 1,5 мільёна злотых. Трэба яшчэ тынкаваць сцены ў васьмі прасторных залах або ababiць іх стружкавай плітой, што зараз вельмі модна. Але не хапіла грошай на ўсё гэта. Таму і затрымка. Пабудова не закончана, а ўсё вакол яе заціхла. А меў жа тут быць і клуб, і кіназал, і бібліятэка.

Як мы даведаліся, не ўсе абмінаюць незакончаны будынак святліцы. Тут апошнім часам адбыліся нават удалыя культурныя мерапрыемствы. Таму грамадскі камітэт будовы намагаецца, каб як мага хутчэй давесці пабудову святліцы да канца. Ён разлічвае на далейшую дзейсную падтрымку і дапамогу гмінных улад у Заблудаве, якім справа рыбалаўскага культурнага аб'екта таксама не абыякавая.

А жыхары Рыбалаў чакаюць і дачакацца не могуць, калі ўжо надыйдзе той жаданы час, калі распачнецца жывая дзейнасць „сваіх“ калектываў: драматычнага (тут ужо традыцыя) ці харавога; калі ўжо моладзь будзе мець дзе абмяркоўваць свае надзённыя справы, а таксама наладжваць доўгачаканыя тут танцавальныя вечарыны.

(Ця)

З маёй званіцы

Быццам бы ў гіпнозе

Чалавек — як рыбак, які, седзячы ў спушчаным на хвалі часу чоўне свайго жыцця, за кожным разам выцягвае ўсё іншую рыбіну, ведаючы аб тым, што ніколі не зможа злавіць другі раз тую самую. Але часам бывае так, што пападзе такая, якая прыгадвае былое і паверне назад усю памяць. Вось так, міленькія, было і са мной. Заплыў я неяк сваім чаўном у Аўгустова, што на Бельшчыне. Была нядзеля. Якраз калектыў з Гарадка выступленне меў даваць. Гарадок... З гэтым калектывам упершыню пазнаёміўся я дзесьці ў 1972 годзе, калі ў Інстытуце русіцыстыкі ў Варшаве „Адвечную песню“ Янкі Купалы ставілі. Дасканала памятаю тую цудоўную ігру. Але вернемся ў Аўгустова. Вось сяджу я ў школьнай зале, праўда не надта перапоўненай, бо якраз па тэлевізару футбольны матч ішоў, і ўзіраюся ў сцэну, з якой пачуліся пералівістыя гукі гармоніка Сцяпана Копы і салодкія дзявочыя галасы. Па зале расплылося „Палескія родныя нашы прасторы, як глянеш, ні краю нідзе не відаць...“ І ўжо не ведаю, што са мной дзеецца. Сцэна памалу пачынае расплывацца, уступаючы месца летняму вясковаму вечару. І я ўжо не я, а дзіцё. І, здаецца, не сяджу ў зале, а так, як некалі, хаваюся за пахіленым плотам, каб маці не ўбачыла і не загнала ў хату з увагі на позную пару, ды слухаю, як дзяўчаты, нягледзячы на стомленасць, пасля працавітага дня, прысеўшы на лавачку, спяваюць пад акорды вясковага гарманіста. А галасы мяшаюцца з араматам кветак, плывуць далёка-далёка.

Са сцэны ўзлятаюць усё новыя ды новыя песні. Сядзіш і на сэрцы так прыемна, так лёгка. А перад вачыма быццам бы з кінастужкі мільгаюць усё новыя карціны. Што песня, то і новы кадр мінулага. Вось расплыліся на хвалях меладычнасці словы — „Бясшумна хвалі коцяцца па полі аржаным...“ І перад вачыма шыр палёў. Вось мяжа быццам бы зялёная рачулка, уквечаная па берагах сінегаловымі валошкамі. І, здаецца, не сядзіш, а ідзеш між каласістага мора, удыхаючы ў грудзі церпкі запах палыну і спелай збажыны.

Даўно, даражэнькія, перажываў я такое. Гэта ж не жартачкі! На працягу гадзіны перажыў я тую частку жыцця, якая беспаўторна адышла. Люблю музыку. Люблю песні. Часта бывае, што словы песні крануць за сэрца сваёй глыбінёю, але перад вачыма паяўляецца не былое, а толькі ўяўленне. А тут было інакш. А ўсё таму, што ў гарадоцкім калектыве ёсць тое, што было некалі самым блізкім чалавеку. Тое, што беспаўторна адышло, пакідаючы сваю фатаграфію ў песнях. Вось гэтыя песні, апранутыя ў цудоўныя дзявочыя галасы, якія напамінаюць вёску, вёску адышоўшую, патрапяць зрабіць з чалавекам усё. І так можна было б пісаць ды пісаць. Але гэта не перадасць нават і дзесятай часткі таго, што можна вынесці з выступлення. Калі надарыцца нагода, абавязкова пайдзіце.

М. Шаховіч

АД РОДНЫХ НІЎ

ЖОРНЫ

Мне хлеб не прыеўся,
хоць быў калісь чорны,
я толькі раз'еўся
на нашыя жорны.
Меў дзесяць гадочкаў,
як смак іх пазнаў.
Тады я для бацькі
круціць памагаў.
Не раз да палудня
над імі трасліся,
бы тыя два дурні:
ох, як упякліся!
Як жменьку усыплеш
і спінку сагнеш,
не менш разоў трыццаць
на ёй закрунеш.
Дагэтуль стаялі,
на іх я дзівіўся;
пад плот размахалі —
каб луб разваліўся.
Угледзела маці,
так іх шкадавала:
„А колькі на іх я
калісь гаравала“.
Сваіх я жаронкаў
зусім не шкадую,
іх дзеці не любяць
і я на іх злую.

А. Леўшук

ЭТНАГРАФІЧНАЕ АКЕНЦА



Вятрак непадалёк вуліцы Дольнай у Гайнаўцы.

Фота В. Дамброўскага.

ПРАЦА Ў СВАІМ АСЯРОДДЗІ

(Працяг са стар. 1)

Галоўнае праўленне будзе таксама рабіць захады, каб апрача беларускага календара штогод выдаваць адну літаратурную кніжку, а праз кожныя чатыры гады адзін літаратурны альманах.

Усе спамянутыя задачы павінны выконвацца побач са штодзённай добрасумленнай прафесіянальнай працай нашых членаў у сваіх установах і на гаспадарках. І вельмі важна, каб нашыя гурткі БГКТ былі ініцыятарамі грамадскіх пачынаў, каб акружалі яшчэ лепшай апекай грамадскую маёмасць, каб клеймавалі праявы вандалізму, каб дакладна разумелі, што сучасны патрыятызм павінен ісці ў нагу з памнажэннем матэрыяльных вартасцей, у тым ліку і вартасцей матэрыяльнай і духоўнай культуры.

У наступным годзе мы будзем святкаваць 60-ую гадавіну Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, і значная тут будзе роля Беларускага таварыства як прапагандыста польска-савецкай дружбы.

У дыскусіі выступілі: Міхась Вішанка, Леакадзія Зіневіч, Язэп Альшэўскі, Альжбета Цаглярская, Янка Зенюк, Хведар Галёнка, Аляксандр Баршчэўскі, Віктар Швед, Мікалай Суліма і Хведар Садоўскі. Ва ўсіх выступленнях адчувалася жаданне павялічыць дасягненні БГКТ ва ўсіх галінах яго дзейнасці.

Падсумаваў дыскусію старшыня ГП Мікалай Самоцік. Затым запрапанаваў ён склад камісій. Камісію культуры ўзначаліць Янка Зенюк. У склад яе ўвойдуць: Ніна Цыванюк, Віктар Швед, Ада Чэчуга, Валянціна Ласкевіч, Сяргей Лукашук, Анатоль Мартыновіч, Валянціна Мароз, Люба Гаўрылюк і Людміла Васілюк.

Камісія асветы будзе працаваць пад старшынством Аляксандра Іванюка ў наступным складзе: Сцяпан Трафімюк, Вольга Гарустовіч, Аляксей Карпюк, Уладзімір Сцепанюк, Галена Тапалянская, Пётр Зубрыцкі, Яніна Чэрнякевіч і Уладзімір Паўлоўскі.

Наступным пунктам парадку дня была інфармацыя сакратара ГП БГКТ Янкі Зенюка аб працы прэзідыума за перыяд ад VIII з'езду БГКТ і I пленума да II пленума ГП.

Міхась Хмялеўскі

(Працяг на стар. 1)

БЕЛАРУСКІЯ АКЦЭНТЫ Ў БЕЛАВЕЖСКІМ МУЗЕІ

кі. Займальна выглядаюць таксама 2 бочкі і 1 каробка, выкананыя з саломы каля 1920 г. Ануфрыем Котам з Бельшчыны, кошычак з накрыўкай з 1920 г., зроблены Пятром Гербацэвічам з Катлоў, верша Юльяна Рубчэўскага з Цярэмкаў, арыгінальны кошычак з 1956 г. Сымона Лобача з Лукі, торба на хлеб з бярозавай кары, кошэль. Цэласць дапаўняюць 2 саламяныя каробкі і 1 ракітны кошычак.



Фрагмент этнаграфічнай секцыі.

У частцы керамікі, што знаходзіцца побач з пляцёнкамі, паказаны 3 гліняныя збанкі, 2 такія ж бунькі, 1 міска, 1 гаршчок і арыгінальныя гліняныя двайнячкі з накрыўкай, зробленыя ў 1891 г. у Пружане. Цэласць упрыгожвае вялікі здымак ганчара пры працы.

Ёсць у этнаграфічнай секцыі і частка, у якой наведвальнік можа ўбачыць адзенне жыхароў Белавежы і наваколля. Знаўца адразу скажа, што яно тыпова беларускае. У зашклёнай шафцы і дзвюх вітрынах паказваюцца кашулі (мужчынская і жаночая) з характэрнай крыжыкавай вышыўкай, хустка, саламяны капялюш, плеценыя лапці, мужыцкая куртка, жаночая спадніца і хвартушок, а таксама шлюбны чапец Тэклі Галёнка з Ласінкі (пашыты ў 1910 г.). Побач вітрын змешчана фотакопія эскіза „Белавежаначка" А. Камінскага з 1912 г.

Ля часткі з адзеннем ёсць частка з вялікімі здымкамі, на якіх паказана характэрнае ўпрыгожванне дамоў у вёсцы Махнатае і Старое Беразова. На іншых здымках можам убачыць пакрытую саломай хату ў вёсцы Макаўка, верх хаты ў Новаберазове, фрагмент дома ў Анцутах і калодзеж з жураўлём.

Беларускія акцэнты спатыкаюцца і ў секцыі бортніцтва. Адзенне бортніка ці яго прылады працы выяўляюць многа рыс нашай нацыянальнасці. Сам бортнік, паказаны на здымках, гэта беларускі селянін Філімон Вашкевіч з Белавежы. Здымак жыхара Белавежы (перад секцыяй бортніцтва) у мясцовым народным касцюме таксама прадстаўляе селяніна-беларуса Сцяпана Краўчука.

Тэкст і фота
П. Байко

Ветэрынарная лячэбніца

У развіцці жывёлагадоўлі вялікую ролю адыгрывае ветэрынарная служба. Дзейнічае яна ўсюды там, дзе ёсць жывёла: у сялян, у СКР-ах, спулдзельнях прадукцыйных і ПГР-ах. Дзякуючы ветэрынарным спецыялістам, якіх штораз больш, амаль не існуюць такія хваробы дамашняй жывёлы, як туберкулёз, бруцэлоз, мыт і многія іншыя інфекцыйныя хваробы.

У Кляшчэлях ветэрынарная служба складаецца з трох чалавек: лекара Аляксандра Дэм'янюка, які з'яўляецца кіраўніком лячэбніцы, і двух ветэрынарных тэхнікаў — Анатоля Жыўлюка і Міколы Коціка. Чацвертая асоба з іх калектыву — Рыгор Верамеюк, які жыве ў Чаромсе і там выконвае заданні лячэбніцы.

Чацвёра ветэрынараў абслугоўваюць Кляшчэлеўскую, Чаромхаўскую і палавіну Дубіцкай гміны. Многа ўвагі яны ўдзяляюць прафілактыцы. Магчыма, таму ў бягучым годзе ў раёне іх абслугі не абнаружылася туберкулёза і бруцэлоза ў кароў. Дбаюць тут аб здароўі маладняка. Што датычыцца дойных кароў, дык гэтай дбайнасці не хапае ў саміх гаспадароў. Часта сустракаецца ў кароў запаленне вымені. Не стараюцца гаспадары, каб у хлявах было суха, каб карова не лягала ў мокры гной, які выклікае запаленне вымені.

Парасятам ветэрынары робяць па некалькі прафілактычных прывівак супраць анеміі і калібацылоза, а калі яны падрастуць — супроць ружы. На працягу года кляшчэлеўская ветэрынарная служба робіць такіх прывівак амаль 4 тысячы.

Істотнай справай ў захаванні здароўя жывёлы з'яўляецца рацыянальнае кармленне жывёлы і якасць кармоў, а таксама якасць штучных мяшанак. Вось таму час ад часу правярае іх кляшчэлеўская ветэрынарная служба. Кантроль неабходны і таму, што многія гаспадары, якія гадуюць свіней, не даюць жывёле вады, і часта свінні ад смагі п'юць гнаёўку, а тады хварэюць на жалудак.

Заданні лекара і ветэрынарных тэхнікаў — арганізоўваць прафілактычныя санітарныя мерапрыемствы, як, напрыклад, бяленне (вапнаванне) хлявоў-свінарнікаў, што абеззаражвае іх, як пабудова вокан і вентыляцыі.

Праводзіцца таксама барацьба з глістнымі захворваннямі. Датычыць гэта перш за ўсё буйных статкаў. У большым статку жывёлы, дзе яна мае беспасрэдны кантакт між сабою, праз корм, ваду, паветра хутчэй распаўсюджваецца інфекцыя.

У раёне абслугі кляшчэлеўскай ветэрынарнай службы ёсць буйныя авечкаводы, у якіх праводзіцца адматылічванне авец.

Кляшчэлеўская ветэрынарная служба паспяхова спраўляецца і з бягучымі паслугамі. На працягу года ў сярэднім праводзіцца кастрацыя 50 жарабцоў, 40 бычкоў, 50 кныроў і 30 бараноў. У сярэднім даводзіцца лячыць 60 штук кароў.

Коні хварэюць пераважна на ахват, найчасцей тады, калі яны не працуюць



Кіраўнік кляшчэлеўскай ветэрынарнай лячэбніцы — лекар Аляксандр Дэм'янюк.

і стаяць у хлявах, а атрымоўваюць шмат кармоў, якія маюць многа вугляводаў (перш за ўсё авёс).

Аб Аляксандру Дэм'янюку людзі вельмі добра гавораць і як аб чалавеку і як аб спецыялісту. Працуе ён у кляшчэлеўскай лячэбніцы ад 1973 года, а яе кіраўніком з'яўляецца ад месяца лютага бягучага года.

Калі гаворыць ён аб сваёй працы, падкрэслівае той перыяд, калі быў на стажыроўцы ў Гайнаўцы: „Тады атрымаў я добрую практычную падрыхтоўку". Аляксандр Дэм'янюк — працавіты чалавек. Ён бесперапынна павышае свае веды. Збіраецца напісаць доктарскую працу. Апрача таго, шмат часу прысвячае ён грамадскай працы. З'яўляецца членам гміннага праўлення Фронту адзінства народу, членам камісіі здароўя гміннай рады нарадовай і актыўным членам ЗСЛ.

Аляксандр Дэм'янюк з'яўляецца таксама чытачом нашага часопіса. Падпісчыкам „Нівы" быў ён ужо тады, калі вучыўся яшчэ ў беларускім ліцэі ў Гайнаўцы. Аб вучобе ў ліцэі засталося ў яго многа незабыўных успамінаў. З сардэчнасцю гаворыць ён аб сваіх былых настаўніках, а найбольш аб сваім выхавацелю, матэматыку Уладзіміру Рушуку, які, як ён сказаў, вывеў яго ў жыццё.

Тэкст і фота **Міхася Хмялеўскага**

Беларуская літаратура — Аляксанар Баршчэўскі

НАШАНІЎСКАЯ ПАРА

МАКСІМ ГАРЭЦКІ — ЧАСТКА І

Вядомы беларускі празаік, гісторык літаратуры, публіцыст нарадзіўся ў сялянскай сям'і 6 (18) лютага 1893 года ў вёсцы Малая Багацькоўка Магілёўскай губерні. Родная вёска Гарэцкага знаходзілася каля сотні кіламетраў ад чыгункі. Пачатковую адукацыю атрымаў ён у вёсцы Вялікая Багацькоўка. Пасля вучыўся ў вёсцы Вольша. Заканчэнне вольшанскай школы давала яму права навучаць дзяцей у вясковых школах. Настаўнічаць, аднак, Гарэцкаму не давялося. У момант заканчэння школы ў Вольшы не было яму нават 16 год. Цяжка сабе ўявіць пятнаццацігадовага настаўніка ў тагачаснай школе, у якой вучыліся дзеці розных узростаў.

Маладога Гарэцкага, зрэшты, вабіла перспектыва далейшай адукацыі. Добра падрыхтаваўшыся, паступіў ён у 1909 годзе ў Горацкае каморніцка-агранамічне вучылішча, якое паспяхова закончыў у 1913 годзе. Пачалася праца мярнічага на Віленшчыне. Гарэцкі цэлыя месяцы праводзіць у вёсках, займаючыся землямернымі заняткамі.

Праз год быў ён прызваны ў армію. Служыў у артылерыйскай брыгадзе ў Вільні. У тым жа 1914 годзе пачалася першая сусветная вайна, і Гарэцкі быў уцягнуты ў яе страшэнны вадаварот. Яго брыгада прымала ўдзел у аперацыях на прускім тэатры вайны. У адным з баёў ён быў цяжка паранены і адпраўлены ў тыл на лячэнне. Выздаравеўшы, зноў трапіў на фронт на Палессі.

У хуткім часе цяжка захварэў. Прайшоў праз многія госпіталі і камісіі. Наследствы хваробы аказаліся вельмі сур'ёзныя. У 1917 годзе Гарэцкі быў канчаткова звольнены з арміі.

Кастрычніцкая рэвалюцыя застала пісьменніка ў Смаленску. Гарэцкі пачынае працаваць у новых установах. Займаецца рэквізіцыяй прыватных кватэр для патрэб дзяржаўных устаноў і іх супрацоўнікаў.

Займаўся таксама публіцыстыкай, пішучы артыкулы ў рускую газету „Известия Смоленского Совета" і беларускую „Дзенніца".

Няўдачна закончылася спроба Гарэцкага вучыцца ў Смаленскім археалагічным інстытуце. Трэба было сумяшчаць шматлікія заняткі з вучобай. Урэшце прыйшлося інстытут пакінуць.

На самым пачатку 1919 года, пасля стварэння Беларускай Савецкай Рэспублікі, сакратар кампартыі Беларусі Кнорын запрасіў Гарэцкага ў Мінск. Прыехаўшы ў сталіцу Беларусі, пачаў ён працаваць у газеце „Звязда".

І тут наступіў радыкальны паварот у жыцці пісьменніка. У лютым 1919 года была створана Літоўска-Беларуская Рэспубліка. У сувязі з тым, што „Звязда" мела быць афіцыйным органам новых цэнтральных улад, Гарэцкі пераехаў у Вільню, якая стала сталіцай новай рэспублікі.

Ужо 21 красавіка 1919 года войскі Пілсудскага захапілі Вільню. Цэнтральныя адміністрацыйныя і палітычныя ўлады Літоўска-Беларускай Рэспублікі пераехалі ў Мінск. Аднак, Гарэцкі застаўся ў Вільні. Утрымоўваў кантакт з падпольным камуністычным рухам, рэдагаваў таксама беларускую дэмакратычную газету „Беларускія ведамасці". У пачатку 1922 года быў арыштаваны польскай паліцыяй і пасаджаны ў турму на Лукішках. Выйшаўшы з астрогу, пераехаў у Латвію, а ў канцы 1923 года — у Савецкую Беларусь.

Працаваў выкладчыкам у Беларускім універсітэце ў інстытуце беларускай культуры і ў Акадэміі навук БССР.

У перыяд культу асобы Гарэцкі быў беспадстаўна абвінавачаны ў вядзенні дзейнасці, накіраванай супраць Савецкай дзяржавы. Памёр 20 сакавіка 1939 года. Пасля XX з'езду КПСС пісьменнік быў ачышчаны ад закідаў і дзякуючы гэтаму вярнуўся на належнае яму месца ў гісторыі беларускай літаратуры.

(Працяг са стар. 1)

можна супольна выпіць чаёк і падзяліцца тортам.

Такіх сустрэч з рабочымі сем'ямі, *радаслоўныя якіх ад многіх пакаленняў запісаны былі працай,* Леакадзія Зіневіч наладзіла ўжо некалькі. Сустракаліся мы з сем'ямі каляснікаў, ганчароў, друкароў, рабочых шклозаводаў і цаглянай вытворчасці. А за кожным разам з'яўлялася перад намі жывапісная гісторыя рабочага класа Беласточчыны.

✲

Адначасова пад сцягам прафсаюзаў былі праведзены іншыя культурна-асветныя мерапрыемствы. Між іншым, агляд культурнай дзейнасці сярод рабочых гайнаўскіх прадпрыемстваў і установаў, а таксама рабочы фэстын у Чорнай Беластоцкай, які стаў сапраўдным святам цэлай гміны.

Нядаўна сустракаўся я з Францішкам Хлебусам, які з'яўляецца старшынёю прафсаюзнай рады фабрыкі сельскагаспадарчых машын у Чорнай Беластоцкай.

Сярод дрымучых лясоў на нашых вачах даўнейшая Чорная Весь ператварылася ў 9-тысячны гарадок. Вось тут

НЕ ТОЛЬКІ ХЛЕБАМ І ПРАЦАЙ

патрэба адначасовага развіцця прадукцыі і духоўнага ўзбагачэння штодзённага жыцця рабочых прывіваннем ім культурных патрэб — справа вельмі важная.

— Мы аб гэтым не забываем, — кажа мне старшыня Хлебус, — для прыкладу: двойчы праводзілі мы на фабрыцы павятовыя спаборніцтвы да конкурсу на найлепшае выкананне савецкай песні. У гэтым годзе наша фабрыка з'яўлялася арганізатарам ваяводскіх спаборніцтваў у рамках гэтага конкурсу. Дзеля польска-савецкай дружбы праводзім мы шмат іншых культурна-асветных мерапрыемстваў. Наладжваем груповыя экскурсіі ў Савецкі Саюз, арганізуем выстаўкі і гутаркі, якія знаёмяць нашых рабочых з жыццём нашых савецкіх сяброў, паказваем савецкія фільмы.

✲

Старшыня Францішак Хлебус расказваў мне яшчэ пра дзейнасць заваддскога клуба тэхнікі, члены якога дзякуючы свайму тэхнічнаму вынаходству, сэканомілі звыш 5 200 зл. у пераліку на аднаго рабочага фабрыкі. Даведаўся я пра чорнабеластоцкіх спартсменаў, якія ў многіх галінах спорту не адпускаюць перадавых месц у Беластоцкай акрузе. Не адрываючыся ад працы, ўжо 420 рабочых фабрыкі здабыло дыпломы тэхніка машынабудавання ў час заняткаў у вячэрнім механічным тэхнікуме. Супольнымі намаганнямі ўсяго рабочага калектыву і жыхароў Чорнай Беластоцкай ствараецца зараз вялікі цэнтр адпачынку ў жывапісным кутку Букштэльскай пушчы, дзе можна будзе пагуляць, паплаваць і пакупацца.

✲

Не толькі працы і хлеба патрабуе чалавек для жыцця. Гэта факт. І таму ваяводская рада прафсаюзаў супольна з іншымі грамадска-асветнымі арганізацыямі зусім нядаўна наладзіла двухдзённую папулярна-навуковую канферэнцыю, у час якой абмеркаваны былі праблемы кшталтавання новых маральных і звычаёвых вартасцей на прадпрыемствах, у жылых пасёлках і ў сям'і. Канферэнцыя была вельмі павучальная.

(вр)

Магчыма, стане спецыялізацыяй

Мілейчыцкая гміна, начальнікам якой з'яўляецца Мікалай Бартнічук, налічвае 21 вёску, у тым ліку 17 — гэта салэцтвы. Людзі тут гаспадарныя. Безупынна шукаюць новых дарог, якія б вялі да развіцця сельскай гаспадаркі. Але тут не ўсё ідзе аднолькава гладка, так як не аднолькава хутка плывуць рэкі, хаця ўсе яны называюцца рэкамі. З адным лепш, з другім горш. Ад некалькіх год пачынае тут заўважацца нейкі выпрацаваны напрамак дзейнасці.

У гміне на першае месца пачынае выходзіць жывёлагадоўля. Зразумела, да спецыялізацыі, беручы поўнасцю значэнне гэтага слова, яшчэ далекавата, але падкладка, трэба сказаць, добрая, ужо ёсць. Вось хаця б прыклад, які можа даць скупка жывёлы. План і выкананне ідуць амаль паралельна. За дзесяць месяцаў быў ён выкананы ў 98%. Адхіленні, як відаць, мінімальныя і пакуль што не такія яны істотныя. Гэта ж планы месячныя, а найважнейшае тое, што пакажа год. А дрэнна напэўна не будзе.

Начальнік гміны ў Мілейчыцах Мікалай Бартнічук.

Але вернемся да гэтай вядучай галіны. На першае месца выходзяць тут Клімковічы, Любейкі і хутар Паканева. У Паканеве паўстаў калектыў сялян: Свідэрскі Геранім, Зеляneўскі Чэслаў, Скшыцкі Казімір і Струсь Тадэуш (яго выбралі кіраўніком). Сяляне вырашылі спалучыцца тут у адну цэласць і заняцца жывёлагадоўляй. Гмінныя ўлады сустрэлі гэта з вялікім задавальненнем і дапамаглі скамплектаваць цэлую дакументацыю, патрэбную для пабудовы кароўніка на восемдзесят кароў. Другім прыкладам, падмацоўваючым сказанае, можа быць мясцовы СКР. Тут, аднак, справа выглядае інакш. Тут думку аб жывёлагадоўлі насунулі цяжкасці. СКР атрымаў 450 гектараў зямлі з дзяржаўнага фонду, якая ляжыць у ста кавалках. Заняцца толькі і выключна землеапрацоўкай — карысці не будзе. Занадта ж гэтая зямля раздробленая. І вырашылі на першы план паставіць свінагадоўлю, а апрацоўка зямлі пакуль што будзе як падтрымка задуманага. З думкай аб гэтым пачалі камплектаваць дакументацыю на пабудову аборы на чатыры тысячы штук свіней. Спадзяемся, што пройдзе некалькі год, і ў Мілейчыцах жывёлагадоўля стане спецыялізацыяй.

М. Шаховіч

фота Міхася Хмялеўскага

Міхалова, вуліца Беластоцкая. *Фота Я. Цялушэцкага*

ФАЛЬ

СЯМЕЙ

Ой, зышлісе мужыкі,
ой, зышлісе мужыкі,
говорылі об жонкі:
— Ой я пэршу жонку меў,
ой я пэршу жонку меў,
як на небі зорочку.
Я з пэршою дзеці меў,
я з пэршою дзеці меў,
а з другою годоваў.
А з другою годоваў,
а з трэцёю россылаў:

Ад Вікторыі Шумарскай, год 80
пісаў 12 кастрычніка 1976 г. Міка
магнетафоннай стужкі Людмілы П

ШТО НОВАГА Ў ГМІНАХ?

БЕЛЬСКАЯ ТРЫКАТАЖНАЯ

У Бельску распачалася пабудова трыкатажнага прадпрыемства, якое тут было запланавана шмат гадоў таму назад, але не магло дачакацца паспяховай рэалізацыі. Будзе яно выпускаць дзіцячую вопратку на 70 мільёнаў злотых у год. Працаваць на гэтым прадпрыемстве будзе чатырыста чалавек, і, такім чынам, значна зменшыцца праблема забеспячэння працай бельскіх жанчын.

РАСТУЦЬ РАДЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ

У гміне Міхалова дзейнічаюць 44 пярвічныя партыйныя арганізацыі (ПОП), у радах якіх знаходзіцца 650 членаў і 63 кандыдаты партыі.

У Ціванюках 13-асабовая арганізацыя на працягу апошніх двух гадоў павялічылася на чатыры асобы. Немалая ў гэтым заслуга сакратара партыйнай арганізацыі Міхала Лук'янюка.

40-асабовая ПОП пры ГС у Міхалове прыняла ў свае рады пяць чалавек. Актыўным сакратаром гэтай арганізацыі з'яўляецца Анатоль Супронюк.

ПОП на тарфяным прадпрыемстве „Імшар" непадалёку ад Новай Волі налічвае 26 членаў. У апошнім часе прыбыло ў арганізацыю шэсць кандыдатаў партыі.

З дзевятнаццаці чалавек складаецца зараз ПОП у кааперaтыве сельскагаспадарчых гурткоў (СКР) у Міхалове. Павялічылася яна на пяць кандыдатаў. Дзелавіты сакратар — Сяргей Гарэнюк.

Вясковая партыйная арганізацыя ў Тапалянах павялічылася на пяць кандыдатаў і, такім чынам, у яе радах зараз сямнаццаць чалавек. Працу ў арганізацыі вядзе энергічная кіраўнічка, настаўніца па прафесіі Ніна Вазнеўская.

У рады адзінаццаціасабовай партыйнай арганізацыі на швейным прадпрыемстве ў Міхалове нядаўна ўступілі чатыры новыя члены. Гэтую перш за ўсё жаночую арганізацыю ўзначальвае сакратар Казімір Пракаповіч.

ВОДАПРАВОД

Жыхары Міхалова (іх звыш 2 200 асоб) захацелі мець ваду з крана. Намнога ж лягчэй адкруціць кран, чым цягаць вёдрамі са студні. Да таго філіял аднаго з беластоцкіх жыллёвых кааператываў распачаў тут будаўніцтва жылых дамоў, да якіх неабходна адразу падключыць ваду з крана. У сувязі з гэтым гмінныя ўлады вырашылі пашырыць водаправодную сетку прынамсі да 15 кіламетраў і ахапіць ёю ўсё мястэчка. Зараз будова закончана. Водаправодная сетка падключана да чатырох глыбінных (артэзіянскіх) студняў і вады хапае ўсім.

Пабудова водапровода з'яўляецца апорай для каналізацыі, над пабудовай якой гмінныя ўлады ў Міхалове ўжо дзелавіта думаюць.

Варта дадаць яшчэ, што нядаўна ў Міхалове закончылася пракладка асфальтнага палатна на вул. Гарадоцкай — ад цэнтра мястэчка аж да малачарскага прадпрыемства і базы СКР. Рамантуецца рэстаран ГС-у.

ЗВЫШПЛАНАВАЯ ПРАДУКЦЫЯ НА РЫНАК

100-асабовы рабочы калектыў швейнага прадпрыемства ў Міхалове кожны год перавыконвае свае прадукцыйныя планы. Займае лепшыя месцы ў спаборніцтве за зніжэнне сабекошту і павелічэнне выпуску прадукцыі. Іменна таму даручана яму экспартная прадукцыя, з рэалізацыяй якой яно паспяхова спраўляецца.

Міхалоўскія швеі шыюць рознае — паліто, піжамы, дзіцячую і мужчынскую бялізну, коўдры. У мінулым годзе ў гонар VII з'езду партыі яны скроілі і пашылі 320 мужчынскіх кашуль. Сёлета таксама адгукнуліся на заклік партыі і прэзідыума ўрада да павелічэння прадукцыі. Дружны жаночы калектыў выканаў грамадскі чын агульнай вартасцю ў 20 тысяч злотых. Працуюць тут грамадскім чынам і мясцовыя жыхары.

УЗНАГАРОДЫ ЮБІЛЯРАМ

Гарадская і гмінная ўправа ў Супраслі прызнала юбілейныя ўзнагароды чатыром асобам, якім нядаўна споўнілася па 90 год. На ўрачыстай сустрэчы атрымалі іх дзевяностагодкі: Анна Рамаўская і Ян Куркоўскі з Супрасля, Анастасія Матэйчук з Агароднікаў і Уладзіслаў Вільчынскі з Варонічаў.

БУДЗЕ ГМІННЫ ЦЭНТР ЗДАРОЎЯ

Дагэтуль цэнтр здароўя ў Заблудаве знаходзіцца ў цесным памяшканні. Цяжкія тут умовы працы лекараў і сярэдняга персаналу. Ёсць аднак надзея, што гэтак будзе нядоўга. Побач выраслі сцены будынка, у якім з часам паселіцца гмінны цэнтр здароўя. У ім будуць працаваць дзве агульныя амбулаторыі, тры стаматалагічныя, дзве педыятрычныя ды гінекалагічная. Будзе 36 асоб медыцынскага персаналу. Гмінны цэнтр здароўя разам з вясковымі філіяламі будзе абслугоўваць 12 000 людзей.

Пра пабудову цэнтра здароўя найбольш клапоціцца доктар Мацей Заблоцкі. Дзякуючы яго арганізатарскім здольнасцям удалося знайсці патрэбную колькасць будаўнікоў розных прафесіяў сярод вясковых рамеснікаў ды сабраць неабходную колькасць будаўнічых матэрыялаў.

БУДЗЕ СУЧАСНЫ РЭСТАРАН

Над ракою ў гмінным пасёлку Нараўка распачалося будаўніцтва гэсаўскага рэстарана на 200 месц. Памяшканне будзе мець таксама „атэльную" частку на некалькі дзесяткаў месц. Гэты аб'ект будзе спрыяць шырэйшаму развіццю турызму ў гэтым маляўнічым наваколлі. На будову прызначана 1 мільён 400 тысяч зл.

Янка Цялушэцкі

Дарагое Сэрцайка, я маю добрага сябру Валодзю. Ад маленства, можна сказаць, адзін без другога кроку не ступілі. Жывем па-суседску. І вось Валодзя пазнаёміўся з дзяўчынай Ліляй, якая нядаўна прыехала ў нашу вёску на працу. Я зайздросна спаглядаў, калі яны гулялі разам на забаве, шпацыравалі ці хадзілі на рэчку. І шкада мне было, што гэта ён, а не я прабывае заўсёды з ёю. Але ж, думаю, Валодзя мой сябар, у дарогу не палезу. А сэрца гаворыць што іншае. Падабалася яна мне штораз больш. І аднойчы, калі Валодзя паехаў у горад да брата на некалькі дзён, не вытрываў я, рызыкнуў пагаварыць з ёю. І што, яна таксама вельмі прыхільна да мяне аднеслася. Дагаварыліся сустрэцца яшчэ раз. І тады абое прызналіся, што падабаемся адзін другому. Ліля сказала, што Валодзі яна не кахае, што толькі так сабе з ім хадзіла і хацела б хадзіць са мной. Мы спатыкаліся штодзень. Але вярнуўся Валодзя. Калі на другі дзень спаткаў я яго, быў ён сумны, расчараваны. Сказаў, што Ліля нейк абыякава аднеслася да яго, не хоча спатыкацца. Не ведаў, што здарылася. Я слухаў і маўчаў. Не хапіла адвагі сказаць праўду. Шкада мне Валодзі, не ведаю, ці ісці на спатканне. Але Лілю я моцна кахаю. Чуюся вінаватым. Памажы.

Мірэк з Бельшчыны

Мірэк! Сумняваюся, ці доўга трывала б сяброўства Лілі з Валодзем, калі б нават не ўмяшаўся ты. Бач, як лёгка яна яго пакінула. Не быў бы ты ты, быў бы іншы. Валодзя можа мець жаль да цябе, можа падумаць, што ты адбіў яму дзяўчыну. Але няпраўда. Няма сілы прымусіць кахаць таго, да каго сэрца не кладзецца.

Сэрцайка

ВЕР-НЕ ВЕР

Сніцца мне так. Уваходжу я на кухню. Ля стала збоку сядзіць мой нябожчык тата. Мама нешта робіць; бачу: рэжа цыбулю. А кухня мая (люблю, каб была чысценькая) вельмі забруджаная, балаган. Кажу: „Мама, ці не магла б ты акуратней гэту цыбулю рэзаць, а то ўсюды цыбуля...“ „Дзе?“ — пытае яна. А я адлеплiваю кавалкі нарэзанай цыбулі ад стала, ад шуфлядкі і паказваю ёй. Ці не захварэю я або мая мама?

Веся

Мне прыснілася, што я бачыла ў кіёску вельмі многа яечак. Хацела іх купіць, але не рашылася. Баюся...

Ніна з Беластока

Сніўся мне страшэнны сон. Быццам нарадзіла я дзіця. Кладу яго на пліту, яно ўсё меншае, меншае, нарэшце бачу: ляжыць на пліце нейкі кавалак ні то хлеба, ні то дрожджэй, сама не ведаю, што гэта было. Як успомню гэты сон, дык яшчэ і сёння трасуся ад страху.

В.М.

Мне прыснілася, што цалаваў мяне адзін знаёмы, якога ўжо няма ў жывых. Лез цалавацца проста ў губы, і ад гэтага мне было вельмі агідна. Чую нясмак аж да сёння. На другі дзень мне снілася міліцыя. Што могуць абазначаць гэтыя два сны?

Барыс

Веся! Чакае вас нейкая значная перамена (балаган на кухні), у сувязі з якой будуць нейкія сямейныя спрэчкі з-за грошай (цыбуля). Думаю ўсё ж, што вы ўсё перажывеце ў спакоі і доўгавеччы (вы ж бачылі бацьку-нябожчыка).

Ніна з Беластока! Вас чакаў нейкі прыбытак (яечкі), але вы пройдзеце міма яго.

В. М.! Вас пацешыць не магу. Чакае вас здрада і сямейныя непрыемнасці.

Барыс! Сны вашы нядобрыя. Пацалунак мужчыны, хаця ён ужо і нябожчык, абазначае нейкі фальш. Другі сон таксама прадвяшчае, што будуць нейкія непрыемнасці, крыўда.

Астрон

Кансультацыя юрыста

ПЫТАННЕ: Н., памершы, пакінуў двух сыноў, якія вучыліся і пражываюць у горадзе, працуючы ў дзяржаўных установах. Брат Н., хаця пражывае у вёсцы, сельскай гаспадаркай не займаецца. Некалькі год перад смерцю Н. гаспадарку яго фактычна вёў сын яго брата, якому ён абяцаў гаспадарку запісаць, але гэтага не зрабіў. Каму прыпадзе сельская гаспадарка?

АДКАЗ: У звычайным парадку права на спадчыну маюць у першую чаргу дзеці, а калі хтосьці з іх не жыве — яго дзеці, г.зн. унукі спадкадаўцы. Толькі тады, калі няма дзяцей і ўнукаў, спадчыну атрымоўваюць браты і сёстры спадкадаўцы, а калі хтосьці з іх не жыве — яго дзеці. У сувязі з тым, што сельскую гаспадарку могуць наследаваць толькі тыя, якія на сельскай гаспадарцы працуюць і маюць кваліфікацыі да кіравання сельскай гаспадаркай — парадак наследавання сельскай гаспадаркі адменны ад звычайнага. Таму ў нашым прыкладзе сыны Н. не будуць наследаваць гаспадарку. І хаця жывуць сыны Н., наследнікам мог бы быць яго брат, калі б працаваў на гаспадарцы Н. перад яго смерцю. Не атрымаў бы ён спадчыны, калі б нават утрымоўваўся з сельскай гаспадаркі, але не з гаспадаркі Н., а, напрыклад, са сваёй уласнай гаспадаркі. Тым больш не можа ён наследаваць гаспадарку Н., калі ўтрымоўваецца з працы па-за сельскай гаспадаркай. Затое яго сын, які працаваў на гаспадарцы Н., калі гэта праца была асноўнай крыніцай яго ўтрымання, будзе наследаваць сельскую гаспадарку, хаця Н. гаспадарку на яго не перапісаў і не ўстанавіў яго наследнікам дзякуючы завяшчанню.

Куток практычных ведаў

ЯК ПАДРЫХТОЎВАЦЬ ЦЕСТА НА СВЯТОЧНЫЯ ПІРАГІ

Варта памятаць заўсёды, што як пірагі, так і мяса ці стравы, прызначаныя для запякання, устаўляем у духоўку, нагрэтую перад гэтым 15 мінут у такой тэмпературы, у якой будзем пячы страву. Калі ў духоўцы ёсць тэрмометр, то справа выглядае вельмі проста. Проста адпаведна рэгулюем полымя газу або настаўляем электрычны выключацель:
для бісквітаў тэмпература павінна быць 150^{0}-180^{0}C;
для цеста на дрожджах — 180^{0}-200^{0}C;
для крухкага цеста — 220^{0}-240^{0}C.

Калі пры духоўцы няма тэрмометра, клопатаў будзе крыху больш. Мае тут значэнне сіла газу ці электрычнага току. Наогул, калі пячэм бісквітнае цеста ці бабку, то полымя газу ў духоўцы не павінна перавышаць 1 сантыметр. Для дрожджавай булкі полымя газу ў духоўцы трэба павялічыць, а крухкі пірог пячы ў гарачай духоўцы, каб пёкся хутка і каб не вытапліваўся з яго тлушч.

Горш тым гаспадыням, якія пакуль што вымушаны пячы пірагі ў звычайнай печы. Тут ужо павінен ім шмат падказваць іх вопыт.

Бісквітны пірог пячэм мінут 40-60, правяраючы праз 20 мінут, ці не заслаба пячэцца (тады газ трэба крыху павялічыць); калі ж пірог пячэцца захутка, трэба газ крыху зменшыць, або накрыць пірог алюмінееевай фальгой ці пергаментнай паперай.

Пірог на дрожджах пячэм ад 25 мінут (вузкія, невялікія бляшкі) да 60 мінут (вялікія бляшкі). Праверыць праз 15 мінут пячэння, як пячэцца. Перад тым, як будзем вымаць пірог з духоўкі, трэба праверыць яго палачкай, уколатай у сярэдзіну пірага. Калі палачка будзе сухая — значыць, пірог гатовы.

Крухкія пірагі, у залежнасці ад велічыні і таўшчыні іх пячэм мінут 10-20.

Праз 5 мінут пячэння цеста павінна ўжо ружавець. Вымаем з духоўкі, калі ўсюды будзе мець аднолькавы залаты колер. Калі яно знізу занадта прыпякаецца, трэба формачкі з цестам паставіць на адвернутую ўверх дном бляшку або падставіць пад іх асбеставую сетку.

Падрыхтоўваючы бляшкі, трэба памятаць, што пад бісквітнае цеста змазваем іх тлушчам і пасыпаем цёртай булкай, пад дрожджавае — толькі змазваем тлушчам, а пад крухкае цеста бляшкі можна не змазваць.

Гаспадыня



Разгром „лясных бегуноў“, зладжаная работа разгалінаванай сістэмы разведчыкаў атрада, безумоўна, садзейнічалі выкананню новых задач Цэнтра. Аднак цяпер камандзір „Сокалаў“ адказваў не толькі за рознабаковую дзейнасць аднаго свайго атрада. Яму даручалася аказваць патрэбную дапамогу іншым разведвальным групам, асобным разведчыкам. Каб лепш выконваць гэтыя задачы, Арлоўскі, які яшчэ не зусім папраўіўся пасля цяжкага ранення, пачаў рэарганізацыю свайго даволі вялікага атрада.

Больш чым дзвесце байцоў і камандзіраў налічваў атрад „Сокалы“. Каб дзейнічаць больш манеўрана і ахопліваць сваімі аперацыямі большы раён, Арлоўскі аддзяліў ад „Сокалаў“ атрад імя Кірава, камандзірам якога быў назначаны лейтэнант М. П. Боцін. Дзейнічаў гэты атрад у Быценскім і Ляхавіцкім раёнах. У сваю чаргу „Сокалы“ раздзяліліся на дзве групы. Частка байцоў засталася на ранейшай базе, у Машукоўскім лесе, астатнія перабраліся да невялікага ляснога возера Качайла, кіламетраў за восем на поўнач ад Выганаўскага возера. Гэтая база была далей ад магістраляў, лепш захаваная ад раптоўнага нападу акупантаў, тут знаходзіліся асноўныя запасы боепрыпасаў, харчавання. База каля возера Качайла лепей падыходзіла і для прыёму людзей з Масквы. А для разведвальнай і дыверсійнай работы выбралі базу ў Машукоўскім лесе.

Акрамя гэтых баз, у глухіх лясных нетрах былі абсталяваны яшчэ восем запасных.

У канцы мая 1943 года, услед за тэлеграмай у Цэнтр: „Папраўіўся. Адчуваю сябе бадзёра. Прыняў камандаванне атрадам. Раман“ — Арлоўскі радзіраваў: „Гарантуем рух нашых разведчыкаў у Брэст, Сядлец, Мінск“. Праз некаторы час ён паведаміў Цэнтру болей падрабязна аб магчымасцях атрада: „Можам накіроўваць разведчыкаў на працяглую работу ў Брэст, Беласток, Мінск, Сядлец і Варшаву. Не мае значэння, хто яны: мужчыны ці жанчыны. Пажадана толькі, каб яны ведалі польскую мову. Для гэтага мы маем надзейных і правераных людзей, якія могуць наладзіць з разведчыкамі бесперабойную сувязь“. У адказ на гэта Цэнтр радзіраваў: „На базу „Сокалаў“ хутка накіруем спецыяльную групу „Вест“ на чале з „Лясковым“. Дапамажыце яму парадай і дайце групу байцоў для суправаджэння „Веста“.

„Вест“ па-нямецку значыць „Захад“, групу назвалі так невыпадкова. Групе трэба было прабірацца на захад — у Беластоцкую вобласць, у Польшчу, весці там разведвальную работу. Камандзірам „Веста“ быў чэкіст Аляксандр Міронаў, які дзейнічаў пад псеўданімам „Ляскоў“.

„Сокалы“ па-брацку сустрэлі „Вест“, выдзелілі надзейных праваднікоў. Разам з групай пад Беласток адправіліся лепшыя байцы атрада Павел Верабёў, Павел Гаўрыс і Іван Турэйка.

Забягаючы некалькі наперад, скажам, што пазней, пасля адлёту Кірылы Арлоўскага на вялікую зямлю, на базы „Сокалаў“ былі выкінуты самалётамі спецыяльныя разведвальныя групы „Вясеннія“, „Запарожац“, „Стычань“, „Літаратар“, і ўсім ім таксама дапамаглі байцы „Сокалаў“ і іх камандзіры хутчэй уключыцца ў справу.

Надзейных, вопытных праваднікоў не раз вылучалі „Сокалы“ і для партызанскіх атрадаў імя Дзяржынскага, „За Радзіму“, „Дзядзі Васі“, брыгад імя Грызадубавай, Флягонтава.

12 ліпеня Цэнтр паведаміў, што Раману прысвоена званне падпалкоўніка дзяржаўнай бяспекі. Пра астатніх таварышаў у тэлеграме нічога не гаварылася. У той жа дзень Арлоўскі зноў накіроўвае тэлеграму ў Цэнтр з настойлівай просьбай прысвоіць званні мужным байцам і камандзірам „Сокалаў“. Гэта толькі штрышок, які гаворыць аб пастаянным клопаце Арлоўскага пра сваіх падначаленых. Гэты клопат бачылі, цанілі байцы і плацілі свайму строгаму, патрабавальнаму але справядліваму камандзіру ўзаемнасцю.

● ● ●

Уціхамірыць Беларусь акупанты спрабавалі не адзін раз, адну за другой праводзілі карныя аперацыі супроць партызан і мясцовага насельніцтва. Асабліва вялікія надзеі ўскладваліся на буйную карную аперацыю супроць баранавіцкіх партызан пад кодавай назвай „Герман“, якая праводзілася летам 1943 года.

Гэтая аперацыя рыхтавалася ў строгім сакрэце. Звыш 50 тысяч салдат і афіцэраў налічвалі эсэсаўскія часці, кінутыя супроць партызан, — добра ўзброеныя, з самалётамі, танкамі, артылерыяй.

Напярэдадні аперацыі гітлераўцы кі-

ТРЫБУНА чытачоў

Новыя крамы ў Бельску

Канец бягучага года ўзбагаціў горад Бельск новымі, прасторнымі крамамі. На вуліцы М. Бучка была адкрыта новая тэкстыльная крама, на вуліцы А. Міцкевіча — крама з садавінай і агароднінай, а па-суседску спажывецкая крама.

У будове знаходзіцца спажывецкі павільён на вуліцы 1 Мая і М. Навоткі. Усё гэта робіцца, каб аблегчыць пакупку гаражанам і жыхарам аколіц Бельска.

Мікалай Няплоха

ЗДАЕЦЦА

Здаецца
гэта так проста
так проста
быць чалавекам
Здаецца
хопіць адно слова
адна ўсмешка
адзін позірк
О не
слова варожае
ўсмешка хітрая
позірк воўчы
Ці так мае быць
дзесьці ў душы чую
сардэчны смех
губы ціха шэпчуць
цёплыя словы
Адзін незнаёмы прахожы
кідае
ветлівы позірк

Міша Андрасюк,
Гайнаўскі беларускі ліцэй

* * *

і толькі шумам
дрэў
бязлістная сірата
сябра ветру
казыча пачуцці
мурлык-мурлык
на сэрцы
бо душы не мае
папіхае арэлі
дзіцячыя
кацячы матыў
мурлык-мурлык
расчараваўся немацатой
сам пагойдаўся
няма кошкі і вясны
адна восень
мурлык-мурлык

Ю. Хмялеўскі

нулі сваю агентуру на разведку партызанскіх сіл. Атрымалі яны некаторыя дадзеныя і аб атрадзе „Сокалы". „У лагеры цяпер наступныя атрады: „Масквічы" — 50 чалавек, падрыўная група „Бязрукага" — 200 чалавек, усе дастаўлены сюды на парашутах...", — даносіў у штаб Готберга оберштурмфюрэр Хайс. Не было ў той час у „Сокалаў" двухсот чалавек, не ўсе яны, як вядома, былі дастаўлены на парашутах. Ды і базіраваўся атрад не зусім там, дзе ўказваў эсэсаўскі разведчык. У партызан была лепшая разведка.

Дзякуючы сваім разведчыкам партызаны і цяпер загадзя даведаліся пра планы гітлераўцаў, пра карную экспедыцыю гітлераўцаў супроць „Сокалаў", пра колькасць і ўзбраенне атрада карнікаў. Майстар раптоўных нападаў, нечаканых udараў з засад, Арлоўскі вырашыў і на гэты раз апярэдзіць праціўніка і арганізаваць яму „гарачую" сустрэчу далёка ад базы атрада.

Напад быў вельмі нечаканы, ён ашаламіў эсэсаўцаў, многія з іх, не паспеўшы зрабіць і аднаго стрэлу, былі забіты ці паранены, астатнія кінуліся ўцякаць.

Поспех засады быў поўны: 23 забітых, у тым ліку двух афіцэраў, і 9 параненых пакінулі карнікі на ўзлессі.

Але, на жаль, у гэтым баі загінуў і ветэран атрада „Сокалы" Іосіф Якубоўскі.

(Працяг будзе)

Хуліганы

Яшчэ яны не перавяліся і даюць пра сябе знаць на розных одпустах, забавах. Нахлёбчуцца гарэлкі і дурэюць, ажно платы трашчаць. Хаця і нядрэнна міліцыя карае хуліганаў, аднак яны ніяк не каюцца.

Гаспадар плот ставіць не для хуліганаў, але яны першае, што робяць, гэта ломяць плот і са штахетамі ганяюць адзін аднаго.

Трэба вастрэй адносіцца да гэтага ўсім. Колькі разоў у дубіцкай калегіі каралі хуліганаў, ды пра платы ніхто чамусьці не хацеў і слухаць.

М. Панфілюк

Сабачая справа

Ад пачатку лістапада на правым баку вуліцы Чырвонай Арміі ў Бельску, паміж чыгуначнай станцыяй і мастом на рацэ Белай ляжыць забіты сабака. Шмат людзей праходзіць сюдою на працу, у школу, праязджае шмат машын. І ўсе гэта бачаць. Але той, хто адказвае за парадак, не падумаў, каб забраць сабаку, ачысціць вуліцу. Трэба гэта зрабіць, як найхутчэй.

Мікалай Няплоха

Каштуе, але выгада якая!

Цяпер мода на мураванкі. Хто сабе будуе дом, дык у плане мае таксама, якімі печамі будзе аграваць будынак і як з вадой. Ці хадзіць з вядром да калодзежа, ці мо як у горадзе... Дык вось мода ўжо гарадская: печ — цэнтральнае ацяпленне, вада — у хаце з крана.

У Дубічах Царкоўных паравое ацяпленне і ваду з крана мае ўжо 10 гаспадароў. Вядома, гэта каштуе (каля 60 тысяч зл.), аднак якая ж выгада!

Мікалай Панфілюк

Усё практычна

У клубе „Практычная пані", што існуе пры ВСС „Сполэм" у Бельску, адкрылі фотагурток. Рабіць здымкі вучыць Аляксей Чыквін. Ён цікава і ўмела вядзе заняткі.

Тут жа адбываецца яшчэ навука танца, а на курсах „Добрай гаспадыні" і „Маладой гаспадыні" жыхаркі горада вучацца варыць і шыць.

Іван Кірызюк

Калі будзе план?

У Бельску ў апошнія гады шырока развіваецца індывідуальнае будаўніцтва. Асабліва відаць гэта на ўскраіне горада, дзе выдзяляюцца пляцы для будовы. Напрыклад, цэлая вуліца Вашкевіча — гэта новыя, прыгожыя дамы.

Не ўсе, аднак, у каго ёсць фінансавыя магчымасці, могуць будаваць сабе дом. У такой сітуацыі знаходзяцца жыхары, якія жывуць у квартале горада паміж вуліцай Акжэі і Дубічы. Адзін з жыхароў расказаў мне, што ўжо некалькі год без вынікаў стараецца атрымаць дазвол на пабудову ўласнага дома. Паказаў мне ён цэлую папку карэспандэнцыі, якія напісаў і атрымаў ад гарадскіх і ваяводскіх улад. А дазволу дагэтуль няма.

Уся бяда ў тым, што няма апрацаванага плана загаспадарання гэтага раёна горада Бельска. План ёсць, але агульны, а дакладнага няма. Пакуль няма плана, нельга будаваць, бо яшчэ невядома, дзе планісты вызначаюць новыя вуліцы, а дзе месца на будаўніцтва. А людзі чакаюць і далей жывуць у старых хатах.

І што найважнейшае, невядома, калі план будзе і хто яго мае выканаць: гарадскія ці ваяводскія архітэктары. Можа ўлады нашага горада адкажуць бяльчанам на гэтыя пытанні? (лор)

Віядук і іншыя

У Чаромсе ёсць шмат спраў, якіх не могуць рашыць мясцовыя ўлады. Напрыклад, чыгуначны віядук. Цэнтральная дырэкцыя ПКП у Варшаве тлумачыцца, што гэтую будову можна будзе пачаць рэалізаваць разам з пабудовай станцыі. Але гэта ж праблема нумар адзін для ўсіх жыхароў гміны! Гмінны і вузлавы камітэты ПАРП, гмінная ўправа не задаволіліся такім адказам і ўсе свае праблемы прадставілі ваяводскаму камітэту партыі і ваяводскай управе.

У заканчэнні хачу закрануць заўсёды актуальную справу нашых гандлёўцаў. Хоць крыху і паправілася ў гэтай галіне, аднак многа яшчэ трэба зрабіць. Лепш забяспечваць таварамі крамы, на час дастаўляць булкі, хлеб і малако і самае галоўнае — палепшыць адносіны прадаўшчыц да людзей. Бо лозунг „Кліент наш пан" пайшоў у Чаромсе ў забыццё.

Ул. Сідарук

Як дастаўляюць „Ніву"?

Ужо трэці тыдзень, як ніяк не атрымаеш „Ніву" перад нядзеляй. Бывала і так, што „Ніву пісьманосец прынясе аж у сераду. Чаму?

На гэтую тэму мне давялося гаварыць з пісьманосцамі на пошце Трасцянка — Уладзімірам Андрэюком і Мікалаем Паланкевічам. Яны гавораць, што гэтыя апошнія разы заўсёды прывозяць меншую колькасць экземпляраў „Нівы" і начальнік пошты вымушаны штораз складаць інтэрвенцыю, каб дасылалі „Ніву". А пісьманосцы ў першую чаргу дастаўляюць „Ніву" ў школы з беларускай мовай навучання, бо там яна неабходная ў вучобе.

Бывала і так, што давезеная потым „Ніва" не заўсёды была апошнім нумарам, а замянялі старымі.

Варта, каб аб гэтым сур'ёзна падумалі адпаведныя ўлады і прысылалі „Ніву" ў Трасцянку на час. Тут людзі ўжо ў пятніцу выглядаюць пісьманосца. А нашым пісьманосцам няма кепскай пагоды. Іх штодзённа бачым у вёсках і за гэта ім падзяка.

М. Лук'янюк

Дні савецкага фільма ў Бельску

Савецкія фільмы ў Бельску вельмі папулярныя. Дні савецкага фільма праходзілі тут ад 3 да 30 лістапада. Фільмы дэманстраваліся ў кіно „Зніч" на вуліцы 1 Мая. Ахвотных заўсёды многа. Днём найчасцей кіно запаўняла школьная моладзь, вечарамі — старэйшыя. Як кожны год, так і цяпер, у пачатку агляду кіраўніцтва правяло міні-конкурс. Датычыў ён ведаў аб Савецкім Саюзе. Вучні ахвотна адказвалі на пытанні, найлепшыя атрымалі кніжныя ўзнагароды. Найбольшую папулярнасць у гледачоў маюць ваенныя фільмы. Усім падабаліся фільмы „Разарванае кальцо" і „Партызаны Каўпака".

Кветка

*

У кіно „Зніч" дэманстраваўся савецкі фільм „Партызаны Каўпака". У ім паказана дзейнасць гераічнага партызанскага атрада і яго камандзіра Сідара Каўпака. Зала кіно была бітком набіта.

Многія з бельскіх гледачоў добра памятаюць Пятра Вяршыгару, які са сваім атрадам дайшоў пад Мілейчыцы, Чаромху і Кляшчэлі. Я чуў, як адзін чалавек пасля фільма расказваў, як „каўпакоўцы" прыйшлі ў іх сяло, каб адпачыць пасля цяжкага бою пасля пераправы праз раку Буг.

Варта паглядзець фільм усім жыхарам паўднёва-ўсходняй Беласточчыны, многія з іх памятаюць славутых партызан — „каўпакоўцаў".

Іван Кірызюк

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

Да публікацыі: „АДКАЗ ДА ЧАГОСЬЦІ АБАВЯЗВАЕ", "Ніва" № 43 (1078) ад 24.X.76 г.

Białostockie Przedsiębiorstwo Produkcji Leśnej „Las" w Białymstoku w odpowiedzi na notatkę umieszczoną w „Niwie" w sprawie budowy magazynu na wyroby ze słomy we wsi Wojnówka, uprzejmie informuje, iż istotnie zamierzaliśmy w/w budowę zakończyć w I półroczu br., jednak ze względu na ograniczenie inwestycji w roku 1976 i przyznanie limitu wyłącznie na zadania kontynuowane, ujęte planem inwestycyjnym, niestety nie byliśmy w stanie wywiązać się z swojej obietnicy.

Obecnie przyznany limit na rok 1977 również ujmuje przede wszystkim zadania kontynuowane, niemniej będziemy czynili starania, by obiekt ten w roku 1977 doprowadzić do stanu pozwalającego na jego właściwe użytkowanie.

Dyrektor Stefan Daszkiewicz

Да публікацыі: „РАМАНТУЮЦЬ, АЛЕ ЯК?", „Ніва", № 40 (1075) ад 3.X.76 г.

Rejon Dróg Publicznych w Bielsku Podlaskim w odpowiedzi na notatkę zamieszczoną w „Niwie" informuje, że ruch na drodze Hajnówka — Dubicze Cerkiewne faktycznie był wstrzymany na krótki okres czasu, w związku z remontem drogi, gdyż prowadzenie prac pod ruchem stwarzało niebezpieczeństwo dla pracujących ludzi oraz dla użytkowników drogi. Ruch pojazdów samochodowych odbywał się drogą objazdową z Dubicz Cerkiewnych przez Wojnówkę, Orzeszkowo do Hajnówki, dłuższą o około 10 km.

Odnośnie wstrzymania remontu Czytelnik nie ma racji, gdyż roboty polegające na odnowie nawierzchni przez powierzchniowe utrwalenie smołą i grysami zostały wykonane zgodnie z planem na długości 18,8 km tj. na odcinku Hajnówka — Dubicze Cerkiewne — Jelonka.

Zastępca Dyrektora
Rejonu Dróg Publicznych
Włodzimierz Antoniuk

Да публікацыі: „БАЛАГАН", „Ніва", № 37 (1072) ад 12.IX.76 г.

W odpowiedzi na notatkę krytyczną dotyczącą zamkniętego klubu we wsi Tarnopol zamieszczoną w Waszym czasopiśmie wyjaśniam, co następuje:

- klub „Rolnika" zorganizowano w miejscowości Tarnopol w 1972 roku,
- w latach 1972—1976 zdołano zorganizować jedynie jedną imprezę z udziałem miejscowej młodzieży o charakterze społeczno-wychowawczym olimpiadę pn. „Co wiesz o Kraju Rad".
- praca klubu opierała się na działalności handlowej, która na skutek małej frekwencji była znikoma (obroty od 2000—4000 zł miesięcznie). Zaznacza się że w Tarnopolu istnieje sklep spożywczy GS).
- koszt miesięczny utrzymania klubu (czynsz dzierżawny, opał, energia elektryczna) przekroczył miesięczną sumę 1 tys. zł.
- miejscowość Tarnopol położona jest na koloniach co utrudnia prowadzenie działalności kulturalno-oświatowej.
- brak jest chętnych kandydatów na stanowisko kierownika klubu.

Dlatego też biorąc powyższe fakty pod uwagę GS „Samopomoc Chłopska" w Narewce zmuszona była zawiesić działalność klubu „Rolnika" w Tarnopolu.

Naczelnik Gminy
Józef Nowicki

Да публікацыі: „З ПАЧУЦЦЁМ АДКАЗНАСЦІ ЗА МАКУЛАТУРУ", „Ніва", № 39 (1074) ад 26.IX.76 г.

W odpowiedzi na notatkę prasową opublikowaną na łamach Tygodnika Białoruskiego „Niwa" dotyczącej odbioru makulatury ze Zbiorczej szkoły Gminnej w Narewce, po zbadaniu sprawy na miejscu, uprzejmie wyjaśniamy, że opisana sytuacja nie wygląda aż tak rażąco.

Zebrana przez młodzież makulatura została jednak odebrana. Podczas prowadzenia w ustalonych terminach społecznej zbiórki złomu i makulatury przez szkoły, Gminna Spółdzielnia „SCH" podstawiała własny transport i odebrała zebrany surowiec do własnego punktu skupu.

Inna sprawa, że pracownik odpowiedzialny za obrót makulaturą pełni jeszcze czynności magazyniera skupu surowców włókienniczych i skórzanych i tym samym mogą zaistnieć nieregularności w odbiorze tego surowca.

Zarząd GS w Narewce wpłynie na zwiększenie operatywności pracownika odpowiedzialnego i zapewni sukcesywny odbiór zebranej przez młodzież szkolną makulatury.

Dyrektor ZOR Z. Dobrzyński

Да публікацыі: „ЯК ЗНАЙСЦІ СПОСАБ НА СПОСАБ", „Ніва", № 42 (1077) ад 17.X.76 г.

Izba Rzemieślnicza w Białymstoku uprzejmie informuje, że w dniu 15 listopada 1976 r. nasz przedstawiciel dokonał kontroli remontu szkoły we wsi Krzywiec, który był wykonywany przez Spółdzielnię Rzemieślniczą Rzemiosł Różnych w Hajnówce. W wyniku komisyjnej kontroli spisano notatkę służbową, której odpis załącza się do niniejszego pisma. W trakcie kontroli stwierdzono, że zarzuty przedstawione w artykule, zamieszczonym w nr 42/1077 z dnia 17.X. 1976 r. w tygodniku „Niwa" nie pokrywają się z rzeczywistością, czego dowodem jest fakt, że użytkownik — inwestor do zakresu wykonanych robót budowlanych, elektrycznych, wod.-kan. i stolarskich nie wnosi żadnych zastrzeżeń.

Należy stwierdzić, że osoba udzielająca informacji redaktorowi nie była zorientowana co do zakresu robót, zleconych spółdzielni.

Jednocześnie nadmienia się, że roboty dotyczące wymiany obróbek blacharskich i przekrycia dachu na szkole nie wchodziły w zakres zawartej umowy nr 35/75 z dnia 1.08.75. Bezinteresownie przedstawiciel Izby Rzemieślniczej wspólnie z wykonawcą ustalili tok postępowania, dotyczący zapobieżenia przeciekom w dachu pkt. 5 notaki służbowej.

Zastępca Prezesa Zarządu mgr. Mirosław Pańko

NOTATKA SŁUŻBOWA

Spisana dnia 15.XI.1976 r. na okoliczność sprawdzenia robót remontowo-budowlanych w szkole podstawowej w Krzywcu. Komisja w składzie: Kowalski Andrzej — dyrektor szkoły, Czepiel Mikołaj — przedstawiciel izby rzemieślniczej, Budka Włodzimierz — prezes spółdzielni rzemieślniczej. Wsiluk Jan członek spółdzielni rzemieślniczej, Romaniuk Jan — nauczyciel szkoły, stwierdziła co następuje: Dyrekcja Szkoły stwierdza, że do robót budowlanych, elektrycznych wodociągowo-kanalizacyjnych i stolarskich nie wnosi zastrzeżeń. Spółdzielnia Rzemieślnicza w Hajnówce do dnia 17 bm. pomaluje dwoje drzwi frontowych. Spółdzielnia rzemieślnicza poza zleceniem, pomaluje 10 sztuk drzwi do 21 bm. tzn IX. Komisja w powyższym składzie stwierdziła, że istnieją przecieki w dachu oraz na złączach obróbek blacharskich. W celu zapobieżenia przeciekom dachu należy wymienić obróbki blacharskie na nowe, oraz dokonać przekrycia dachu pokrytego eternitem na pokrycie blachą z nowym rozwiązaniem więźbi dachowej, ponadto należy rozważyć i rozwiązać sprawę tarasu, który aktualnie jest przyczyną zacieków. Na powyższe należy wykonać dokumentację projektowo-kosztorysową i zlecić do wykonania wykonawcy w trybie pilnym. Zakres robót objętych punktem 5, nie był objęty umową zawartą z dyrekcją szkoły gminnej w Narwi, a Spółdzielnią Rzemieślniczą w Hajnówce. Na tym notatkę zakończono i podpisano.

„Niwa" — Tygodnik RSW „Prasa—Książka—Ruch". Skr. poczt. 149. 15-950 Białystok. TELEFON 2-32-41. Wydawca Przedsiębiorstwo Wydawniczo-Kolportażowe RSW w Białymstoku. PRENUMERATA: Oddziały „Ruchu", urzędy pocztowe i listonosze. Indeks 36911/36671.

Імпартгумар

ДЗЕ Ж ЛОГІКА?

— Вы, безумоўна, зразумееце мяне, грамадзяне суддзі, я не мог яго не ўдарыць!.. Усе яго паводзіны былі безупынным правакацыяй! Ён бесперастанна аказваў уселякія паслугі мне і маёй жонцы.

„Усё ясна! — сказаў я сабе. — Гэтыя двое насталяюць мне рогі і цішком насміхаюцца з мяне!"

І ён і мая жонка былі знаёмы яшчэ перад тым, як я з'явіўся на сцэне. Абое запэўнівалі мяне, што яны „толькі сябры". Павінен я верыць?! Зразумела, не! Напэўна паміж імі нешта было. Чаму ён так часта хадзіў да нас у госці? Чаму ў дні нараджэння рэгулярна рабіў падарункі мне, жонцы і дзецям?

Натуральна, я пачаў за ім назіраць. Калі ён прыходзіў, я забіраў дзяцей, выводзіў іх бяцццам бы на прагулку, а потым нечакана вяртаўся. І што я выявіў? Ні-чо-га! Заўсёды заставаў іх або за гутаркай, або за чытаннем кнігі, або слухаючымі запісы класічнай музыкі!

Можа чалавек зрабіцца нервовым, я вас пытаю? У яго паводзінах не было ніякай логікі! „Можа, ён баіцца, што я нечакана з'яўлюся?" — спытаў я сябе. І вось я сказаў ім, што еду ў дальнюю камандзіроўку і вярнуся толькі праз тры дні. Паехаў я, значыць, а на другі дзень раптоўна вярнуўся. І што я ўбачыў? Ні-чо-га!..

Тут нервы мае не вытрымалі, я яго і ўдарыў. А як не ўдарыць? Ён жа здзекваўся з мяне! Я выязджаю, ствараю абставіны, а ён замест таго, каб цешыцца момантам, павёў маіх рабят на прагулку! „Для таго, — гаворыць, — каб твая жонка магла спакойна рыхтавацца да экзамена". Я забыў вам сказаць, што яна студэнтка-завочніца.

Няўжо я дзеля таго ехаў у камандзіроўку, каб ён маіх дзяцей на прагулку вадзіў? Ды гэта я і сам мог спакойна зрабіць!

Грамадзяне суддзі, сядзьце на маё месца! Вы ж яго павінны пакараць, а не мяне! Каб ён навучыўся сябе весці як трэба, а не дражніць чалавека!

Калі ўсе будуць дзейнічаць так нелагічна, ніколі не наступіць канец агіднасцям у маральным сэнсе слова!

Бл. Калайджыеў
(Балгарыя)



— *Цяпер вы зразумелі, што я намагаўся вам сказаць?*

...Працы з яго імем прыеліся. Трэба было нешта рабіць — прыдумаў псеўданім.





На жаль, так бывае не толькі на арэне.

НА ЎРОКУ ХІМІІ

Выкладчык хіміі напісаў на дошцы: HNO_3, і спытаў у аднаго вучня:

— Якога элемента гэта формула?

— Круціцца на кончыку языка, а ўспомніць ніяк не магу, — адказаў вучань.

— Тады хутчэй выплюнь, інакш абпячэш язык, — сказаў настаўнік. — Гэта — азотная кіслата.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Галіны Жлобін і Ірэны Вашкевіч з Белавежы, Ірэны Васілюк з Чэхаў Арлянскіх і Лілі Скепка з Альхоўкі змяшчаем песню

NIEBO Z MOICH STRON

muzyka: Seweryn Krajewski,
słowa: Krzysztof Dzikowski
śpiewają Czerwone Gitary

Jest w oczach twych
kolor nieba z moich stron
jest słońca blask
cienie liści które drżą,
jest w myślach twych
miejsce wspomnień, które znam
są szepty traw
które giął letni wiatr
Więc zabierz mnie
do tamtych miejsc,
gdzie pędził czas
w rytm naszych serc.
a każdą z chwil
dał tylko nam:
tę dla mnie, dla ciebie,
tę dla mnie, dla ciebie...
Więc zabierz mnie
pod tamten dach,
gdzie pachnie chleb
gdzie cisza gra,
a każda z nut
brzmi tylko nam:
ta dla mnie, dla ciebie,
ta dla mnie, dla ciebie...
Jest w dłoni mej
miejsce na twą małą dłoń,
jak zamknąć mam
nasze życie w klatce rąk?
Jest w myślach mych
miejsce wspomnień, które znasz,
bo często w nim
gościsz tak, często tak.

НА ШЫРОКІМ СВЕЦЕ

— Ох, і колькі ж я сёння змог зрабіць?!

— А што менавіта?

— Адвёз скаты ў рамонт, прывёз цесляра, каб ён адрамантаваў вароты гаража, з'ездзіў за горад, прывёз запчасткі, заправіў машыну ля бензакалонкі і ўзяў яшчэ дзве каністры бензіну... Без асабістых „Жыгулёў" ці ж я столькі паспеў бы зрабіць?!

*

На пешаходным пераходзе ляжыць чалавек. Побач стаіць машына. Паліцэйскі дастае блакнот і пытае ў вадзіцеля:

— Расказвайце, як вы яго збілі.

— Я яго не збіваў. Я проста спыніўся і паказаў яму рукой, што ён можа прайсці. Бедны, напэўна так здзівіўся, што страціў прытомнасць.

*

Дзяжурны па кухні пытае ў кухара пасля таго, як зняў пробу:

— Вы служылі ў арміі ў час вайны?

— Так точна, сэр, — адказвае кухар. — Быў кухарам, двойчы паранены.

— Вам пашанцавала. Проста здзіўляюча, як гэта вас не забілі.





РОЦІК ХОЧА СПАЦЬ

Гледзячы тэлеперадачу, Элачка пачала пазяхаць.

— Час, дачушка, класціся спаць, — сказала мама.

— Не, гэта не я, а роцік хоча спаць, — вытлумачыла Элачка.

ПАМЫЛКА

— Сёння спаткаў вашу жонку.

— І што яна сказала?

— Нічога.

— Гэта была не мая жонка, бо мая не можа маўчаць.

ПРЫКАЗКІ З ПРАЦЯГАМ

„Не адным хлебам жыве чалавек", — апраўдаўся браканьер, калі яго судзілі за забітага лася.

„Адзін у полі не воін", — падумаў п'яны і здаўся арматцам.

„Сэрца не камень", — прызнаўся рэвізор прарабу, які яго частаваў, і выкрасліў з акта недастачу бутавага каменя.

„Не богі гаршкі лепяць", — сказаў селянін, узяўшыся за ганчарны круг, бо ГС не завозіла посуду.

А ДЗЕ Ж КОШКА?

Афандзі прынёс з базару пяць фунтаў мяса з саламі папрасіў жонку зварыць яму на вячэру тлустага наварастага супу.

— Ды ледзь ён выйшаў з хаты, як жонка склікала сваіх сябровак і зрабіла для іх з таго мяса і сала пачастунак. Вечарам Афандзі вярнуўся. Не распальваючы пад катлом агню, жонка села каля печы.

Афандзі спытаў:

— Што ўсё гэта азначае?

Жонка адказала:

— Я выйшла да крынічкі па ваду, а кошка ўкрала мяса з салам, адразу ўсё з'ела і ўцякла.

Афандзі злавіў кошку, паклаў на вагу, зважыў і ўбачыў, што яна важыць роўна пяць фунтаў.

— О бязглуздая ашуканка! У гэтай шкуры вага паказала ўсе мае пяць фунтаў мяса і сала! А дзе ж кошка?

ТАКІМ НАРАДЗІЎСЯ

У сіберны вецер сцюдзёнай зімой
З каханай сустрэціца паехаў,
І снег, што хрысціў ледзяною крупой,
Здаваўся тады мне пацехай.

Затое з прастудай не дзень адляжаў,
І кпілі нязлосна суседзі:
— І хто цябе ў непагадзь гэту пагнаў,
Нібыта не мог пераседзець?

Заўсёды, як што не па мне — на дыбы:
Кастырным, відаць, нарадзіўся...
...У лес незнаёмы папёрся ў грыбы,
І ў пушчы густой... заблудзіўся.

Аж цэлая вёска шукае, не спіць.
Назаўтра знаходзяць пад вечар:
— Няўжо ты дзе з краю не мог пахадзіць,
А пёрся ў такую гушчэчу?

І як ні абходзіў нязведаны лес,
Разумным як быць ні стараўся,
А зноў у гісторыю новую ўлез:
Ў замужнюю я закахаўся...

Хаджу, як зачумлены, сонцу не рад,
Схуднеў. Дакараюць суседзі:
— Няўжо ты не мог каго выбраць з дзяўчат?
І што ты ў замужняй угледзеў?

Дзіўлюся: як свет для мяне вельмі строг,
Бо колькі у ім не жыву я,
І што ні зраблю я: „Няўжо ты не мог?"
Заўсёды з папрокамі чую.

Нямала прайшоў я жыццёвых дарог
Калдобіну кожную помню...
Калі б абысці іх я хітранька мог,
Не знаю, ці лепей было б мне.

Алесь Бачыла



— *Можа ж, калі захоча!*

ІДЭАЛ

— Як вы ўяўляеце сабе ідэальную сакратарку? — спыталі ў дырэктара Дынамюка.

— Ёй павінна быць дваццаць год, і ў яе павінен быць трыццацігадовы стаж працы.

ПАДЗЕЛ ПА-АМЕРЫКАНСКУ

Развод мужа з жонкай — наогул цяжкая справа. Зламалася сямейнае жыццё, перажываюць дзеці, не ведаючы з кім лепш застацца: з бацькам ці маці, перажываюць бацькі за дзяцей, за тое, дзе каму пасля давядзецца жыць, як пабудаваць новы сямейны лад. А вось у багатых сем'ях гэта, як ні дзіўна, праходзіць прасцей.

Яўген Шнэйдар, які пражывае зараз непадалёк ад Нью-Ёрка, не вельмі быў уражаны тым, што яго жонка пасля 33-гадовага сумеснага жыцця ўзбудзіла справу аб скасаванні шлюбу, хаця і не мог даказаць, што ён заўсёды быў верным мужам. Яго больш за ўсё цікавіла, як будзе падзелена хатняя маёмасць, і ён настойліва патрабаваў, каб яна была падзелена напалам. Але жонка прытрымлівалася іншага меркавання: не дзяліць маёмасць, а проста справадзіць валацугу-мужа з дому. Тады, абражаны такім несправядлівым варыянтам, муж выраšыў зрабіць па-свойму: дзяліцца дык дзяліцца — каб нічога не заставалася ні ёй, ні яму. Дачакаўшыся, калі жонка пайшла на работу, Яўген Шнэйдар „папалавініў" і дом, і ўсё, што было ў доме. Жонка вярнулася з работы і за галаву хапілася: уся мэбля і нават тэлевізар былі рассечаны папалам... тапаром. А муж, як ні ў чым не бывала, пазваніў адвакату жонкі, каб той прыехаў і засведчыў, што ўсё падзелена правільна.

А што ж прыйдзецца рабіць адвакату ў такім арыгінальным падзеле па-амерыканску?

Іншы раз для таго, каб выйсці ў людзі, трэба ведаць куды перад гэтым увайсці.